№26
1933 г.

РАБОТНІЦА і КАЛГАСЬНІЦА
БЕЛАРУСІ

Аб парадку выдачы авансаў збожжа ў калгасах

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б І СНК БССР

ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначаюць, што зацяжка ў выкананьні пляну збожжазагатовак у мінулым годзе (па некаторых раёнах і зрыў выкананьня) мела месца ў значнай частцы рашэнаў з тэй прычыны, што існавала беспарадачная рвацкая выдача авансаў збожжа, драпежніцкая растрата і раскрадваньне збожжа па асобных калгасах.

У гэтых калгасах абмалочанае збожжа ў першыя месяцы абмалоту ня толькі не паступала на загатоўчыя пункты, але нават і не пападала ў калгасныя сьвірны, а тут-жа пасьля абмалоту пад відам яўна перапавялічаных авансаў, патрэб на „грамадзкае харчаваньне“, розных „фондаў“ расьцягвалася па руках, прычым пападала больш за ўсё лодырам, кулаком і зладзеям.

Такія адносіны да збожжа прынесьлі вялізарнейшую шкоду ня толькі добрасумленна працуючым калгасьнікам, якія да канца сельскагаспадарчага году аказаліся ў цяжкім становішчы з хлебам, але і нанесьлі вялізарнейшую шкоду дзяржаўным інтарэсам.

У мэтах рашучай барацьбы ў бягучым годзе з расьцягваньнем у калгасах збожжа пад якімі-б там ні было прычынамі ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанаўляюць:

1. Выдача калгасьнікам авансам збожжавых культур да выкананьня дзяржаўных абавязацельстваў можа быць зроблена ў разьмеры ня больш 10 проц. ад колькасьці намалочанай збожжавай культуры (жыта, пшаніца, ячмень, грэчка, проса).

ЦК і СНК абавязваюць сакратароў РК КП(б)Б, нач. палітаддзелаў МТС, старшынь РВК і старшынь калгасаў з першых-жа дзён уборкі збожжавых так арганізаваць справу выдачы авансаў збожжа, каб гэтыя авансы выдаваліся арганізаваным парадкам і толькі па працаднёх, у першую чаргу добрасумленным калгасьнікам-ударнікам і каб агульны разьмер выданага авансу па асобных культурах не перавышаў 10 проц. праведзенага абмалоту гэтых культур.

2. Прадаставіць права райкомам, райвыканкомам і палітаддзелам для асобных калгасаў, узорна арганізаваўшых уборку і атрымаўшых высокі ўраджай, як выключэньне, павышаць паказаны разьмер выдачы авансаў да 15 проц. ад абмалоту збожжавых і, наадварот, паніжаць гэты процант да поўнага выкананьня калгасам абавязацельстваў па пастаўцы збожжа дзяржаве для тых калгасаў, якія дрэнна правялі ўборку, не змагаюцца са стратамі ўраджаю і маюць нізкую ўраджайнасьць.

3. Задаваленьне ўнутрыкалгасных патрэб (грамадзкае харчаваньне, ясьлі і інш.) наперад да поўнага выкананьня калгасам абавязацельстваў па пастаўцы дзяржаве збожжа можа быць праведзена толькі з тых-жа ўстаноўленых 10 проц. абмалоту збожжавых.

ЦК і СНК папярэджваюць райкомы, палітаддзелы і РВК, што ўсякія спробы сарваць пляны збожжаздачы пад выглядам адлічэньняў у розныя „фонды“ або шляхам памяншэньня даных аб фактычным становішчы ўраджаю павінны неадкладна выкрывацца як кулацкае шкодніцтва, а вінаватыя ў гэтым павінны быць строга пакараны.

Член мандатнай камісіі 2-га ўсебеларускага эьезду калгасьнікаў-ударніка т. СКРОБАВА рэгіструе дэлегатаў.

НА ВОКЛАДЦЫ: Дэлегаткі 2-га Ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў ударнікаў т. АЗБЭЛЬ з нацыянальнага яўрэйскага калгасу „Праца“ Хойніцкага раёну і т. ВЕРАМЕЯНКА з калгасу Сталіна Лоеўскага раёну падпісваюць дагавор па сацспаборніцтву на лепшае правядзеньне работы ў часе праполкі, уборкі і здачы збожжа дзяржаве.

С.-А.Г.П.Б.
Инв.

Работніца і Калгасьніца
БЕЛАРУСІ

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

ЛІПЕНЬ 1933 г.
№ 26

Не здамо пяршынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю

Самаабавязацельствы 2-га ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў па сацыялістычным спаборніцтве з Заходняй вобласьцю (РСФСР) на лепшае правядзеньне ўборкі ўраджаю і выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж краямі, рэспублікамі і абласьцямі за высокую ўраджайнасьць, якое разгарнулася з моманту 1-га ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, уступае ў другі адказны і рашаючы пэрыяд сельскагаспадарчага году, пэрыяд праполачнай і ўборачнай кампаніі і здачы дзяржаве сельскагаспадарчых прадуктаў.

У спаборніцтве паміж БССР і Заходняй вобласьцю на лепшае правядзеньне сяўбы пяршынства засталося за БССР. Цяпер галоўная, самая важная задача—посьпехі сяўбы замацаваць узорным правядзеньнем уборкі і сваячасовым і поўным выкананьнем абавязацельстваў перад дзяржавай.

Мы, дэлегаты 2-га ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, ад імя ўсіх калгасаў і калгасьнікаў БССР прымаем выклік Заходняй вобласьці аб прадаўжаньні спаборніцтва на пяршынства ва ўборцы і датэрміновае выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай. Мы таксама ўключаемся ва ўсесаюзнае спаборніцтва на пяршынства ў выкананьні плянаў здачы сельскагаспадарчай прадукцыі дзяржаве, разгорнутае па пачыне Татарскай рэспублікі.

Для таго, каб забясьпечыць збор ураджаю ня менш 8 цэнтнэраў збожжавых культур з аднаго *га*, ня менш 100 цэнтнэраў бульбы і ня менш 2,4 цэнтн. ільну з *га*, каб ня здаць пяршынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю і зрабіць БССР перадавіком усесаюзнага спаборніцтва на лепшую ўборку і сваячасовую здачу добраякаснай сельскагаспадарчай прадукцыі, — мы бярэм на сябе наступныя абавязацельствы, на выкананьне якіх заклікаем усе калгасы і ўсіх калгасьнікаў БССР.

1. Скончыць ва ўстаноўленыя тэрміны сенаўборку да пачатку пасьпяваньня азімых і сваячасова пачаць уборку ўраджаю і ні ў якім выпадку не дапусьціць перастою траў і пераспяваньня збожжавых і інш. культур, убіраць пасобныя вучасткі збожжавых, не чакаючы высьпяваньня ўсёй плошчы.

Збожжавыя культуры ўбраць абавязкова ў часе васковай сьпеласьці. Жыта азімае і пшаніцу за 10—12 дзён, авёс—за 13 — 15 дзён, ячмень — за 6—7 дзён.

Бульбу ўбраць на працягу 15—20 дзён.

Уборку ільну правесьці за 8—10 дзён у раньняй жоўтай сьпеласьці. Непасрэдна пасьля церабленьня правесьці абмалот і расьсьціл ільну, прычым закончыць гэту работу на працягу жніўня і верасьня.

Уборку сена першага ўкосу правесьці за 20 дзён, другога—за 15 дзён. Сеяныя травы першага ўкосу ўбраць за 12 дзён, другога—за 15 дзён. Правесьці рашучую барацьбу з патравамі атавы. Сіласныя культуры таксама ўбраць поўнасьцю і ў тэрмін.

2. Уборку сена і сіласаваньне правесьці так, каб, выканаўшы абавязацельствы перад дзяржавай, стварыць выстарчальны запас сена і сіласу для аграмаджанай жывёлы і недатыкальны кармовы фонд на вясну, а таксама забясьпечыць кармамі і неаграмаджаную жывёлу калгасьнікаў.

3. Арганізаваць начную пасьбу коняй, а таксама забясьпечыць зялёнай падкормкай у першую чаргу слабасільных і працуючых ва ўборачных машынах.

4. Прывесьці ў парадак увесь транспарт, інвэнтар, зброю і не пазьней, чым за тыдзень да ўборкі праверыць іх прыгоднасьць да работы, зрабіўшы адпаведны запас частак для неадкладнай замены ў выпадку паломак або псаваньня.

5. Падрыхтаваць мяшкі, яшчыкі для бястарнай перавозкі збожжа, прыстасаваць вазы—яшчыкі (падсьцілкі) для насыпной перавозкі і падрыхтаваць складзкія памяшканьні для ссыпкі збожжа.

6. Арганізаваць самую пільную ахову ўраджаю ад раскрадваньня, падпалаў на ўсіх стадыях уборкі. Не пазьней чым за 10—15 дзён да высьпяваньня збожжа вылучыць з ліку лепшых калгасьнікаў-ударнікаў ва ўсіх калгасах аб'езчыкаў і ва ўсіх брыгадах дзенных і начных вартаўнікоў, а таксама для кругласутачнай аховы збожжа на таку, пачынаючы з першай стадыі ўборкі, устанавіць строгі ўлік збожжа і іншых культур, адпраўку і выдачу праводзіць выключна па дакумантах і ва ўстаноўленым інструкцыяй Наркамзему СССР парадку. Сурова караць за ўсякія спробы ашукваньня дзяржавы (утойваньне пасеўплошчаў, перапамяншэньне ўраджайнасьці).

7. Разгарнуць сапраўдную барацьбу са стратамі пры ўборцы, для чаго прыладзіць да ўсіх жнявярак зерняўлоўнікі, сваячасова пачаць жніво, падграбаць і зьбіраць каласы, ня траціць зерня пры перавозках і чыста яго вымалочваць.

Ва ўсіх калгасах арганізаваць грамадзкія камісіі па якасьці, якія праз брыгадзіраў дабіваюцца, каб дрэнная, забракаваная работа не аплачвалася, а за добрую работу лепшым калгасьнікам павышалася ацэнка працадня.

ГПБ Сз.-Дв.

8. Правёўшы ўзорную ўборку і ў першую чаргу здачу збожжа, забясьпечыць пасьпяховае выкананьне астатніх сельскагаспадарчых работ, напрыклад: правесьці 2—3 разы культывацыю чорнага папару, другое ўзорваньне папару (на глыбіню 15—18 сантым.) за 10—20 дзён да пачатку сяўбы. Пасьля ўборкі, але не пазьней 20—25 жніўня, пачаць зяблёва. У верасьні правесьці баранаваньне зазябленага поля.

Зьезд бярэ на сябе абавязацельства ўсямерна пашырыць пасяўны клін азімай пшаніцы, у прыватнасьці давесьці ў гэтым годзе пасеў азімай пшаніцы да 65.000 *га*.

9. Устанавіць і выканаць здачу сельскагаспадарчай прадукцыі ў наступныя тэрміны:

а) збожжа—на працягу жніўня і верасьня;

б) бульбы—да 1-га лістапада, прычым рабочым Ленінграду адгрузіць у першую чаргу;

в) лён—мабілізаваць калгасьнікаў і аднаасобнікаў на датэрміновае выкананьне ўстаноўленых партыяй і ўрадам тэрмінаў;

г) правесьці да 1-га верасьня натурай аплату работ МТС па дагаворах з калгасамі за праведзеныя да пачатку абмалоту работы, а за абмалот плату праводзіць кожную пяцідзённку.

10. Разам з нізавым друкам і прадстаўнікамі суседніх калгасаў з 20 па 30 ліпеня правесьці па ўсіх калгасах узаемную праверку падрыхтаванасьці да ўборкі і здачы прадукцыі дзяржаве.

У бліжэйшыя дні ва ўсіх брыгадах на вытворчых нарадах абмеркаваць даныя абавязацельствы і ўстанавіць практычныя задачы барацьбы кожнай брыгады за ўшчыльненьне тэрмінаў уборкі, за датэрміновае выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай. Уся наша работа павінна быць заснавана на дакладным уліку работы, правільнай расстаноўцы сіл ў брыгадах і па зьвеньнях, суровай працоўнай дысцыпліне і адказнасьці як за сваю работу, так і за работу суседа. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінны стаць сьцягам нашай работы на калгасных палёх. Спаборнічаючы калгасьнік з калгасьнікам, зьвяно са зьвяном, брыгада з брыгадай, калгас з калгасам, мы забясьпечым бальшавіцкія тэмпы ў рабоце і даб'емся пяршынства і ў справе ўборкі, і ў справе здачы сельгаспрадукцыі дзяржаве.

Прымаючы гэтыя абавязацельствы да дакладнага і няўхільнага выкананьня, мы адзначаем, што зараз на ўборцы і здачы прадукцыі на справе будзе правярацца магутнасьць кожнага калгасу, устойлівасьць калгасьнікаў у барацьбе з дробнабуржуазнымі перажыткамі і з падрыўной работай недабітага яшчэ клясавага ворага. Іменна зараз, на ўборцы і здачы прадукцыі кожны калгас на справе павінен даказаць сваё уменьне і здольнасьць змагацца за хутчэйшае ажыцьцяўленьне лёзунгу нашага правадыра т. СТАЛІНА — зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі і ўсіх калгасьнікаў заможнымі.

Узорная ўборка, датэрміновае выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай—справа гонару кожнага калгасьніка і калгасьніцы, верны шлях да заможнага калгаснага жыцьця, да новых перамог у барацьбе за бальшавіцкія калгасы, верны шлях уцягненьня новых бядняцка-серадняцкіх мас сялянства ў бальшавіцкія калгасы.

Ухваляючы прапановы перадавых калгасаў БССР, мы прапануем 1-га жніўня (міжнародны антыімпэрыялістычны дзень) і 6-га жніўня (дзень індустрыялізацыі) арганізаваць масавую здачу збожжа дзяржаве шляхам пасылкі ў гэтыя дні калгасных і аднаасобных чырвоных абозаў збожжа новага ўраджаю. Абвяшчаем усе калгасы БССР удзельнікамі гэтага абозу, выклікаем калгасы Заходняй вобласьці пасьледаваць нашаму прыкладу. З гэтага абозу рушым поўным ходам здачу прадукцыі дзяржаве, каб у тэрмін выканаць усе нашы абавязацельствы па спаборніцтве з Заходняй вобласьцю.

Жанчыны на вядучых палявых работах

ДЗЕРГАЧОВА ГАННА—дэлегатка ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, лепшая ўдарніца калгасу „Гігант збожжа", Беразацкага сельсавету Чырвонапольскага раёну.

Калгас „Гігант збожжа" арганізаван у 1929 г. і налічвае зараз 101 гаспадарку. План веснавой пасеўнай кампаніі калгас перавыканаў, замест 454 *га* засеяў 464 *га*. Уся плошча збожжавых культур засеяна пратручаным насеньнем. Узарана папару замест 18 *га* па пляну 65 *га*.

Праполка ўсіх культур закончана па першаму разу, зараз праводзіцца другая праполка.

У справе падрыхтоўкі да ўборкі зроблена наступнае: адрамантован інвэнтар (3 жняркі, 3 малатарні), арганізавана 5 брыгад, якія разьбіты на групы. Брыгады паміж сабою спаборнічаюць. Калгас „Гігант збожжа" заключыў сацыялістычны дагавор з калгасам „Крэмль".

Цягавая сіла да ўборачнай падрыхтавана і прымацавана да брыгад. На кожных 12 коняй пастаўлен адзін конюх.

У калгасе „Гігант збожжа" каля 200 працаздольных жанчын. У часе веснавой пасеўнай кампаніі ў кожнай з 4-х вытворчых брыгад было па 5 дзяўчат, якія аралі, баранавалі. Дзяўчаты ў большасьці перавыконвалі ўстаноўленыя нормы па ворыве. Замест 1 *га* ўтраіх яны заворвалі 1 з пал. гэктара.

ДЗЕРГАЧОВА ГАННА—ЛЕПШАЯ ЎДАРНІЦА-АРАТЫ—ВЫПРАЦАВАЛА З ПАЧАТКУ ГОДУ 116 ПРАЦАДЗЁН.

— Працуем мы як у сябе,—кажа Ганна,—калі дрэнна працуеш, камісія правярае і штрафуе ў 5 працадзён. Ёсьць у калгасе дзьве жанчыны-групаводы. Усе мы сваім жыцьцём задаволены.

Калгасьніцы Шклоўшчыны ў барацьбе за лён

Шклоўскі раён першым з ільнаводчых раёнаў па БССР закончыў сяўбу ільну і за гэта атрымаў пераходны сьцяг ЦК КП(б)Б і СНК, які з гонарам дэлегаты Шклоўшчыны прынялі на 2-м усебеларускім зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў.

І сапраўды ім ёсьць чым ганарыцца.

Калгасы Шклоўшчыны маюць вялікія посьпехі у справе мабілізацыі шырокіх мас калгасьнікаў і калгасьніц на своячасовае і добраякаснае правядзеньне веснавой пасеўнай, праполачнай і ўборачнай кампаній, на ахову сацыялістычнай маемасьці, на падрыхтоўку для здачы збожжа дзяржаве і складаньня кантрактацыйных дагавораў па ільне, на барацьбу за бальшавіцкія калгасы, за заможнае калгаснае жыцьцё.

25 мая калгасы Шклоўшчыны скончылі сяўбу ільну на плошчы 10.503 га—на 35 дзён раней чым у мінулым годзе. Упершыню ў раёне засеяна сэлекцыйнага ільну 1.200 га. План на ільну выканан на 102 проц. План сяўбы звышраньняга ільну быў выканан да 10 красавіка. Зараз ужо не гавораць, што ня трэба рана сеяць—шкада, што болей не засеялі ў гразь.

Калгасы Шклоўшчыны ўжо канчаюць другую праполку ільну.

Люба глядзець на чыстыя зялёныя масывы кудравага сэлекцыйнага ільну ў 80—100 сан. вышынёю, якія калгас „Перамога", Александрыйскага сельсавету, засеяў ў гэтым годзе (102 га замест 100 па пляну).

Гэты год у калгасе „Перамога" зьяўляецца пераломным. У выніку дрэннага гаспадараньня і слабай дысцыпліны ў мінулым годзе калгас „Перамога" перажывае зараз труднасьці. Аднак, урокі мінулага не прайшлі дарма. Выступленьні правадыра партыі т. Сталіна і апошнія пастановы партыі і ўраду аб абавязковай пастаўцы збожжа і бульбы дзяржаве, аб задачах папаравай, праполачнай і ўборачнай кампаній навучылі, як трэба працаваць, зацікавілі ў лепшых выніках працы.

Пераломным гэты год зьяўляецца ня толькі для калгасу „Перамога" і для камуны імя Молатава, Чарнянскага сельсавету, дзе ў мінулым годзе згніла ня зьнятай на полі частка ўраджаю, але і для калгасу імя Луначарскага, які ў мінулым годзе ня выканаў пляну загатовак па ільну. У гэтым годзе новы старшыня калгасу кажа—я ня толькі спраўлюся з плянамі гэтага году, але пакрыю запазычанасьць і мінулага году.

Наладжаньню працоўнай дысцыпліны ў калгасах дапамаглі ясьлі. Па раёне адкрыта 79 ясьляй замест 75 па пляну і 62 пляцоўкі. Дзякуючы гэтаму максымальная колькасьць жанчын была ўцягнута ў палявыя работы.

Па радзе калгасаў Шклоўскага раёну жанчыны вылучаны былі на працу аратых і ня толькі справіліся з гэтай работай, але і паказалі прыклад іншым. Хто з калгасьнікаў калгасу „Перамога" не назаве вам **Пезаву** Фрасіньню, як лепшую ўдарніцу, якая ў часе пасеўнай працавала на ворыве і за адзін май выпрацавала 41,5 працадня, амаль больш за ўсіх у калгасе. За пяцідзёнку з 6/V па 10/V **Пезава** Фрасіньня выпрацавала 7,89 працадня, больш за ўсіх у брыгадзе, бо яна акуратней за ўсіх зьяўлялася на работу. Дый зараз Фрасіньня з канём—скародзіць і выконвае іншыя работы.

Працавала на ворыве і **Кузьміцкая** Каця, якая таксама ад мужчын не адставала і выпрацавала за май 29,88 працадня. **Макарава** Тацьцяна выпрацавала за май 26,19 працадня, **Кабанава** Маша—27,78 працадня, **Дурасевіч** Алёна—23,83 працадня.

Дружна працуюць калгасьніцы ў часе поліва. Пры норме—10 працадзён на адзін га сэлекцыйнага ільну для першай праполкі пры вялікай засьмечанасьці большасьць калгасьніц выпрацоўвае 1,25 працадня. Полюць тут жанчыны палольнікамі-плянэтамі. Лепшыя ўдарніцы **Карпечанка** Ганна, **Алякеева** Марыля, **Алякеева** Вульляна, **Рабцава** Аксіньня аднойчы за адзін дзень плянэтамі прайшлі па паўтара гэктара. Засталося толькі рукамі падчысьціць.

Цікавы вопыт барацьбы 3-яй брыгады калгасу „Перамога" за хутчэйшае і добраякаснае сканчэньне праполкі. Не хапала спачатку ў калгасе плянэт. Тады брыгадзір Валетаў увёў дзьвёхзьменнасьць на рабоце па поліве (з 5 гадзін раніцы да 1 гадзіны дня і з 1-ай гадзіны дня да 9 гадзін вечара) пакуль не дакупілі плянэты. Брыгада гэта, у якую ўваходзяць 42 жанчыны, ідзе лепш за другіх па ўсіх паказальніках. Усе жанчыны тут дружна выходзяць на працу.

Дэлегаткі Шклоўшчыны на 2-м усебеларускім зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў.

— Раней у нас работы усім не хапала, а сёлета ўсе работу атрымалі—толькі працуй,—кажа калгасьніца Макарава Агрыпіна:—і на лядах жанчыны працуюць, і на торфе, і на полі, і ў хляве.

Аднак, дрэнна тое, што ў калгасе „Перамога", дзе налічваецца 175 жанчын, няма яшчэ ясьляй і пляцоўкі. Таму частка жанчын прымушана сядзець дома. Слаба вядзецца барацьба з прагульшчыкамі і прагульшчыцамі, якія яшчэ ёсьць у калгасе. Толькі на час уборкі рыхтуецца праўленьне адкрыць ясьлі. Ужо падрыхтован харчовы фонд, робяць кіпяцільнік. Пад ясьлі бяруць памяшканьне школы.

У калгасах Чарнаруцкага сельсавету, дзе засеяна 478 га сэлекцыйнага ільну, таксама жанчыны ўцягнуты ў працу па ворыве і баранаваньні. У калгасе „Трактарыст" калгасьніца працуе брыгадзірам-паляводам, яна-ж працуе і з плугам. Улік у гэтай брыгадзіршы наладжан так, што яна штодзенна ў абед і ўвечары дае выпікі працы.

У камуне імя Молатава, Чарнянскага сельсавету, 7 жанчын працавалі за плугам і норму ў 0,65 га на параконным плузе пры сярэдняй глебе чым выконвалі, а некаторыя і перавыконвалі. Так, **Дзянісевіч** Ганна выпрацавала за май 34,6 працадня, **Кірыловіч** Зося—30,90 працадня, **Краўцова** Матрона—29,89 працадня. **Галкоўская** Надзя нават сеяла, што амаль ніколі раней не даручалася жанчынам, і норму перавыконвала.

Норма поліва ў камуне—6,40 працадня на адзін гэктар сярэдняй засьмечанасьці. Выпрацоўваюць калгасьніцы 1,58 працадня і нават 1,67. Прагульшчыкі ў камуне адразу прабіраюцца ў насьценгазэце і заносяцца на чорную дошку.

100-проц. выхаду камунарак на работу спрыяе наяўнасьць ясьляй-пляцоўкі, якія знаходзяцца ў прасторным добрым памяшканьні і забясьпечаны харчаваньнем. Толькі кіраўніцы ясьляй былі да гэтага часу вельмі дрэнныя і таму запусьцілі ясьлі (груд, няўважлівыя адносіны да дзяцей). Зараз туды накіравана з раёну новая загадчыца, і ясьлі змогуць запрацаваць узорна.

У калгасе „Ўдарнік" (Александрыйскі сельсавет), які атрымаў сьцяг РК і РВК за лепшае сканчэньне сяўбы, усе 40 жанчын уцягнуты ў палявыя брыгады. Тут добра наладжана праца ясьляй-пляцоўкі. 40 дзяцей знаходзяцца ў вялікім, новым, чыстым памяшканьні. Дзеці вясёлыя і задаволеныя, задаволены і маткі.

У часе праполкі жанчын разьбілі на зьвеньні па 7 чалавек. Гэтыя зьвеньні будуць існаваць на ўвесь пэрыяд цярабленьня. Кіруюць усёй работай па праполцы, цярабленьні і расьсьціле **Сямашка** Наста і **Лісава** Юля—лепшыя ўдарніцы-калгасьніцы, найбольш вопытныя ў рабоце над ільном. Сямашка Наста ўжо падрыхтавалася для працы па ільнацерабілцы.

Вопыт Шклоўшчыны па вылучэньні жанчын-калгасьніц на вядучыя палявыя работы, па стварэньні ім бытавых умоў для работы павінны пераняць і іншыя раёны.

Аднак, разам з гэтымі дасягненьнямі неабходна адзначыць і тыя вялікія прарывы, якія ёсьць у рабоце сярод жанчын Шклоўшчыны. Партарганізацыі раёну амаль нічога не зрабілі па выкананьні дырэктыў партыі ў справе вылучэньня лепшых калгасьніц-ударніц на работу брыгадзіраў, старшынь калгасаў на адказную работу ў сельсаветы. Усяго па раёне ёсьць 5 жанчын—брыгадзіраў паляводчых брыгад і 2 старшыні калгасаў. На адказных пасадах у раёне амаль няма ніводнай камуністкі.

На курсах брыгадзіраў было толькі 4 жанчыны. Курсы старшынь калгасаў, якія павінны былі працаваць пасьля сканчэньня веснавой сяўбы,—пад пагрозай зрыву, бо на сёнешні дзень яшчэ нават ня было адбору курсантак. На курсы старшынь сельсаветаў, якія скліканы ў Менску, Шклоў, таксама нікога ня прыслаў.

Дэлегацкія сходы, якіх у раёне налічваецца больш 40, амаль нідзе не працуюць. Уся работа сярод жанчын абмяжоўваецца зьлётамі (сельскімі, раённымі) і прыцягненьнем жанчын на агульныя сходы. Слабасьць палітыка-выхаваўчай работы сярод жанчын зьяўляецца прычын й таго, што жанчыны самі вельмі супраціўляюцца свайму вылучэньню, што сярод жанчын пашыраны лаянкі, мацяршчына (камуна імя Молатава, калгас імя Карла Маркса).

Райком партыі павінен дабіцца пералому ў разгортваньні палітыка-выхаваўчай работы сярод калгасьніц. Неабходна ўдарыць па апартуністычных разважаньнях асобных сакратароў ячэек (Нікалаеў і інш.) аб тым—ці патрэбны дэлегацкія сходы.

Задачы пасьпяховага правядзеньня ўборачнай і загатоўчай кампаній патрабуюць ад партарганізацый пералому ў справе разгортваньня штодзеннай палітыка-выхаваўчай работы сярод калгасьніц і вылучэньня лепшых ударніц палёў на работу брыгадзіраў, старшынь калгасаў і інш.

Калгасы Шклоўшчыны прынялі выклік Бежыцкага ільнаводчага раёну (Зах. вобласьць) і калгасу „Новае жыцьцё" Слуцкага раёну (БССР) на лепшую ўборку і датэрміновае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай і пастанавілі ўключыцца ва ўсесаюзны конкурс на лепшы ільнаводчы калгас. Са свайго боку яны абавязаліся да 15 жніўня скончыць цярабленьне, абмалот і расьсьціл ільну, дабіцца з кожнага га **„ня менш 3 цэнтн. валакна і ня ніжэй 14 нумару**. Здаць дзяржаве ільнасемя да 1-га жніўня і да 30-га жніўня скончыць здачу трасты і валакна. Выкананьне гэтых абавязкаў зьяўляецца пачэснай задачай кожнай партарганізацыі, сельсавету, калгасу і кожнага калгасьніка і калгасьніцы ў паасобку.

Ударна праведзенай уборкай і датэрміновым выкананьнем усіх абавязкаў перад дзяржавай калгасьнікі Шклоўшчыны павінны і надалей трымаць пераходны сьцяг. **Э. Ш.**

Просім абгаварыць нашу прапанову

Трохі хвалюючыся, расказвае дэлегатка 2-га ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў т. Крывіцкая (к-с „Новае жыцьцё", Шклоўскі раён), як у іх калгасе змагаліся за пераходны сьцяг ЦК і СНК БССР.

„Ні адзін чалавек у нас ня быў без пастаяннай работы, кожны ведаў сваё месца. Брыгады мы разьбілі на групы. Я старшая над жанчынамі. У мяне дзьве групы па 10 чалавек. Часам так бывае, што групы працуюць у розных мясцох, а ў двух жа нельга мне разам працаваць. Дык я ў абед падбягу паглядзець, як ідзе праца, а галоўнае гляджу, каб добра выконвалі працу. Норму ўсе жанчыны перавыконвалі. Пры норме поліва ільну—8 жанчын на 1 га спраўляліся 6 жанчын. Мне цяпер не бяда, сама магу і прачытаць і запісаць выпрацоўку—у лікпункце навучылася зімою. Ніводнага прагулу ў маёй групе ня было, заўсёды на працу выходзілі а 6-ай гадзіне раніцы. Лён у нас у гэтым годзе куды лепшы, чым у мінулым. Мяркуем не інакш як 14 нумарам здаць".

Групаводка к-су імя Будзённага т. Гузікава ўпэўнена, што леташняе ў іх калгасе не паўтарыцца. А было яно такім—лён быў зусім нікчэмны і прышлося яго са здатачнага пункту везьці дадому. У гэтым годзе сваячасова засеялі 44 га і прапалолі два разы. Усходы вельмі добрыя. „Каб дабіцца добрай якасьці—гаворыць Гузікава—у мяне ў групе ўведзена індывідуальная зьдзельшчына. Я сама адмяраю кожнай палольшчыцы вучастак. Дрэнна толькі, што ясьляй у нас няма, і некаторыя жанчыны шмат часу трацяць на догляд дзяцей. Да ўборачнай абавязкова патрэбны ясьлі".

Дэлегаты Шклоўшчыны на 2-м усебеларускім зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў абавязаліся, што ва ўборцы і пастаўцы збожжа і ільну дзяржаве яны таксама будуць перадавымі.

„Мы падтрымліваем словы калгасьнікаў калгасаў „Янгатурмыш", Татарскай рэспублікі, і „Зара рэвалюцыі", Бабруйскага раёну, якія заявілі, што **няма больш пачэснай задачы для калгасьнікаў, як сваячасовае выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай.**

Улічыўшы ўсе магчымасьці, мы абавязваемся **1-га жніўня арганізаваць першы чырвоны абоз з новым ураджаем.**

Просім абгаварыць нашу прапанову ва ўсіх калгасах з тым, каб ужо цяпер разгарнуць ударную падрыхтоўку да першажнівеньскага чырвонага абозу". Так сказалі ўдарнікі Шклоўшчыны на 2-м усебеларускім зьезьдзе. Калгасы БССР павінны падхапіць заклік шклоўскіх калгасьнікаў аб арганізацыі ўсебеларускага чырвонага абозу і ажыцьцявіць яго.

В.

Рыхтуем кадры

У ажыцьцяўленьне пастановы ЦК і СНК БССР па большасьці раёнаў праводзяцца курсы жанчын-старшынь калгасаў. Усяго ахоплена па няпоўных вестках 650 чалавек.

У радзе раёнаў гэтыя курсы закончылі сваю працу (Пухавіцкі, Менскі раён і інш.), але ёсьць і раёны, дзе курсы яшчэ да гэтага часу не пачалі працаваць (Шклоўскі раён і інш.).

На курсах жанчын-старшынь сельсаветаў, якія працуюць у Менску, займаецца зараз 90 чалавек, з якіх значная частка будзе накіравана на работу старшынямі сельсаветаў, астатнія на іншую адказную работу сельсаветаў.

Змагацца за пачэснае месца на чырвонай ўсесаюзнай дошцы.

З ПРАМОВЫ тав. БАЧЭНКОВАЙ, ДЭЛЕГАТКІ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ

Ад імя калгасьнікаў-ударнікаў Заходняй вобласьці другому зьезду калгасьнікаў-ударнікаў Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі перадаю сваё палкае прывітаньне (**аплёдысмэнты**).

Дарагія калгасьнікі і калгасьніцы, ударнікі і ўдарніцы! Па даручэньні Заходняй вобласьці перадаю вам віншаваньне з повaду атрыманьня пяршынства ў веснавой пасеўнай кампаніі над намі, ня гледзячы на ўсе труднасьці, што меліся.

Дарагія таварышы, мы чулі аб усіх вашых труднасьцях у часе веснавой пасеўнай кампаніі.

Я хачу вам сказаць, што мы не супакоіліся на тым, што здалі некалькі тэмпы, мы, Заходняя вобласьць, гэта нагонім.

Першы сноп—дзяржаве

Мы ведаем, што мы адсталі ў веснавой пасеўнай кампаніі, але мы перад партыяй і перад нашай пралетарскай дзяржавай далі абяцаньне падцягнуцца, і мы сваё абяцаньне выканаем. Зааралі папары мы раней тэрміну, праполку скончылі ў тэрмін. Мы і надалей не здамо тэмпаў, а ўпушчанае нагонім.

Давайце, дарагія таварышы, змагацца за пяршынства, за якасьць, за высокі ўраджай і давайце скажам--першы сноп—дзяржаве (**аплёдысмэнты**). Трэба спадзявацца, што мы гэта наша пажаданьне выканаем і перавыканаем.

Дарагія таварышы! Я вось яшчэ што хачу сказаць. Пара нам выканаць слова нашага дарагога правадыра і настаўніка тав. **Сталіна**, які сказаў—зрабіць калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў—заможнымі (**аплёдысмэнты**), а для гэтага трэба працаваць сумленна. Давайце ня кідацца прыгожымі фразамі, а давайце давядзем на справе нашу работу.

(**Шаранговіч**—*правільна*).

(**Аплёдысмэнты**).

Нам ніякі вораг не перашкодзіць

Мы шмат чулі ад сваіх камуністаў і таксама і ад камуністаў БССР аб тых задачах і труднасьцях, якія перад намі стаяць. Дык давайце не дапусьцім такога становішча, каб хоць адно зерне прапала. У нас усё павінна быць у сьвірнах, якія падрыхтаваны ў нас да ўборачнай кампаніі.

Давайце, таварышы, на вашым другім зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў скажам—нам ніякі вораг, ніякі кулак не перашкодзіць. Мы зараз востра трымаем вуха і моцна сьцісьнулі кулак. Трэба не забываць, што мы ўжо трэцюю вясну працуем за бальшавіцкія калгасы. Гэта нам трэба памятаць.

Жанчыны-калгасьніцы! Мне вось што вам хочацца сказаць. Я рада, што прыехала сюды. Я хачу падзяліцца з вамі вопытам, хачу расказаць, якое ў нас становішча. Я чула, што ў вас мужчыны аруць і косяць. Гэта ня цяжкая работа, нам трэба і мы можам узяцца за яе. Тав. Ленін сказаў, што кожная кухарка павінна навучыцца кіраваць дзяржавай. Давайце з сёнешняга дня возьмемся за гэту работу і наогул будзем выконваць усю тую работу, якая на нас ускладаецца.

Жанчына ў калгасе адыгрывае вялікую ролю

У нас, у Заходняй вобласьці, жанчыны-ўдарніцы, а сярод мужчын ні аднаго няма ўдарніка (**сьмех, аплёдысмэнты**).

Я не жартую, а гавару ад шчырага сэрца.

Мы крышку адсталі ў сяўбе, але трэба ўлічыць, што ў нас усю вясну працавалі жанчыны. У нас змагаюцца за якасьць уборкі, за захаваньне каня, у нас да жанчыны прымацован конь. Вось калі-б паглядзелі ў калгасе, ні ад аго каня-б не знайшлі, у якога персьні былі-б зьбіты. Вось як ідзе барацьба.

Т. Бачэнкова.

Я ня ведаю, як у вас, у Беларусі, а ў нас, у Заходняй вобласьці, жанчына адыгрывае вялікую ролю. Мяркуйце самі—жанчына ўсіх даглядае: і дзяцей, і печ і карову.

У нас у калгасе у 1931 годзе ня было ні аднаго мужчыны. Мы, жанчыны, паставілі калгас на цьвёрдыя ногі. Зараз нам нічога не страшна. Таму я і кажу, што мы зараз ня страцім ні аднаго зерня.

Не здамо тэмпаў

Зараз я хачу сказаць, колькі ў нас пасеяна яравых культур па Заходняй вобласьці. Сяўбу мы скончылі на 10 дзён раней, чым летась. Плян сяўбы выканан на 99,1 проц., на жаль не на ўсе 100 проц. Ільну мы пасеялі 113 проц., бульбы—101 проц., збожжавых культур—104 проц.

Ваш сакратар тав. **Шаранговіч** зусім правільна ў сваім дакладзе адзначыў, мы не здамо тэмпаў.

(**Шаранговіч:** *мы таксама не здамо*).

Мы будзем змагацца па-бальшавіцку, каб не здаваць тэмпаў.

(**Шаранговіч:** *правільна, правільна*).

І давайце—вы, БССР, мы—Заходняя вобласьць машней брацца за работу. Давайце не здамо тэмпаў (аплёдысмэнты).

(**Шаранговіч:** *правільна, правільна*).

Устоялі перад усімі труднасьцямі

Я хацела-б падзяліцца вопытам свайго калгасу. Ён праводзіць ужо трэцюю веснавую сяўбу. У нашым калгасе на працягу двух год былі выключна жанчыны. І мы ўстоялі перад усімі труднасьцямі. У нас усе пасты займалі жанчыны. Мы набывалі машыны—жнявяркі, снопавязалкі, малатарні. Гэтым і ўмацавалі свой калгас. А зараз ужо да нас прышлі і мужчыны.

У нашым калгасе высокая працоўная дысцыпліна. 18 гаспадарак калгасу засеялі ў гэтым годзе 107 гэктараў яравых культур. Плян веснавой сяўбы па калгасе мы перавыканалі: па ільну—на 5 гэктараў, па аўсе—на адзін гэктар, па грэчцы—на 1,75 га, а ўсе іншыя культуры засеяны намі на 100 проц.

Зараз мы абмяркоўваем пытаньне аб тым, як-бы нам арганізаваць малочную фэрму. Бо мы ведаем, што калі няма ўгнаеньня, то ня будзе і хлеба, а калі няма жывёлы, то няма і ўгнаеньня.

Я заклікаю ўсіх таварышоў Беларусі працаваць пабольш, і якасьцю лепш, тады ў нас будуць калгасы бальшавіцкія і мы будзем заможнымі.

Таварышы! Наш калгас скончыў ворыва папару рана—25-га чэрвеня. 30-га чэрвеня папар ужо быў забаранаваны. Касьба ў нас разгарнулася поўным ходам. Праўда, тут нам значна перашкаджала дрэннае на вор'е, але нічога, мы тэмпаў не здамо і з гэтай задачай таксама справімся. Мы скосім не пазьней 15-га ліпеня і неадкладна здамо патрэбную колькасьць прадукцыі дзяржаве.

Наш калгас павінен здаць дзяржаве 150 цэнтнэраў сена, 28 цэнтн. жыта, 35 цэнтн. ільну і 5 цэнтн. бабовых І мы ўсё гэта здамо ня толькі ў тэрмін, але і датэрмінова з перавыкананьнем. І што гэта будзе так, я тут перад зьездам даю сваё калгаснае слова (*воплескі*).

Таварышы! Можа быць я што і забыла сказаць, але дазвольце на гэтым скончыць.

Няхай жыве камуністычная партыя бальшавікоў!

Няхай жыве наш правадыр і кіраўнік тав. Сталін!

Няхай жыве Чырвоная армія—моцная абарона нашых межаў!

(*Аплёдысмэнты, „Інтэрнацыянал"*).

ГЦВ Сз.-Ав.

1-га ЖНІЎНЯ АДЗНАЧЫМ УСЕБЕЛАРУСКІМ

Узорная праполка, уборка і датэрміновае выкананьне абавязкаў

ГАВОРАЦЬ ДЭЛЕГАТКІ 2-га ЎСЕБЕЛАРУСКАГА

Нашы тэмпы ня толькі падвоім, але і патроім

т. КАКОРЫНА

Дэлегат з Клімавіцкага раёну

Таварышы, я хачу вам расказаць, як Клімавіцкі раён працаваў у часе пасеўнай кампаніі. Веснавую сяўбу мы скончылі на 20 дзён раней мінулага году, а раён цалкам на 14 дзён раней.

У сацспаборніцтве з Рослаўскім раёнам Заходняй вобласьці і Крычаўскім раёнам мы ўзялі пяршынства. Наш калгас, таксама і іншыя калгасы нашага раёну, стараюцца завяваць пяршынства па праполачнай і ўборачнай кампаніі і асабліва па здачы збожжа дзяржаве. Абавязаліся за 10 дзён закончыць загатоўкі.

Таварышы! Трэба тут адзначыць, якое значэньне маюць палітаддзелы МТС. Калгасы раёну дзеяньня МТС выканалі пасеў на 109 проц.

Як у нас сёньня змагаюцца за ўраджайнасьць? Мы змагаемся за лепшае ўгнаеньне поля, каб узьняць ўраджайнасьць. І вось у нашым калгасе зьбіраюць лісьце для подсьцілу. Рознае зельле, нягоднае для сіласаваньня,—сьвірэпка і інш., намі ўкладваецца ў ямы, у якіх на будучы год будзе перагной. Адкіды мы таксама зьбіраем на ўгнаеньне. У нас няма ніводнага калгасу, які-б не вазіў торф для ўгнаеньня.

Я запэўніваю 2-гі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў, што Клімавіцкі раён ніводнага *га* ў веснавую пасеўную кампанію не засеяў няўгноенага.

Мы ведаем, што калгасы перамагалі і будуць перамагаць. Няма лепшага жыцьця і іншага шляху, як калгасы (воплескі). Тав. Сталін сказаў, што нам трэба зрабіць нашы калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў заможнымі. Толькі тады калі мы будзем ударна працаваць, ня будзем глядзець на сонейка, мы гэтага даб'емся.

Трэба гаварыць ня толькі добрае, але і аб дрэнным, нельга гэтага замазваць. Наш раён скончыў сяўбу 14-VI, наш калгас спазьніўся на тры тыдні.

Чаму зацягнулі сяўбу па ўсім раёне?

Таму, што ў нас ёсьць два сельсаветы, якія ганебна адсталі і за якія прыходзіцца чырванець. Бязумоўна тут адыграў сваю ролю кулак. Мы далі адпор кулаком і гэтыя сельсаветы выканалі пляны сяўбы на 100 проц., але зрабілі гэта з вялікім спазьненьнем.

Тут мала гаварылі аб рабоце сярод жанчын, і ніхто не завастрыў пытаньня аб яслях. Як вызвалена ў нас жанчына і як наогул выхоўваюцца ў нас дзеці? Каб жанчына магла сапраўды па-ўдарнаму працаваць, для гэтага павінна быць арганізаванаграмадзкае харчаваньне, яслі ды пляцоўка. Наш сельсавет глядзеў на яслі панаплявацельску. Чыя туг віна? Вядома, нашых кіраўнікоў—старшыні сельсавету і сакратара ячэйкі. Я прывяду вам прыклад з калгасу „Энэргія".

Ня было раней ясьляй і пляцоўкі, на жанчын глядзелі як на сымулянтак, якія не жадаюць выходзіць на работу. Але калі адкрылі пляцоўку і яслі, арганізавалі грамадзкае харчаваньне, то гэтыя адстаючыя жанчыны сталі перадавымі і яны на зьлёце былі як ударніцы.

Тав. Сталін гаварыў, што жанчына ў калгасе—вялікая сіла і што трымаць гэтую сілу пад спудам, значыць дапускаць злачынства. Гэтыя словы ўрэзваюцца ў сэрца кожнай з нас, бо мы бачым, хто клапоціцца аб жанчыне.

Таму няхай жыве т. Сталін. (Воплескі).

Мы павінны ўважліва слухаць і ўсё запомніць, аб чым тут гаварылі, каб перадаць нашым таварышом, якія засталіся на вёсцы. Мы павінны тут абмяняцца вопытам, як правільна правесьці праполку і ўборку, каб ніводнае зерне не прапала і збожжа з першага абмалоту здаць дзяржаве (воплескі).

Цяпер некалькі слоў аб сваім калгасе.

Усе машыны змазаны, падрыхтаваны да выезду ў поле.

Брыгада з брыгадай спаборнічаюць. Уся рабочая сіла разьбіта на зьвеньні. У кожным зьвяне—5 чалавек і мы ведаем і бачым, як кожнае зьвяно і як кожны калгасьнік працуе.

Я раю, каб у кожным раёне так праводзілі працу—гэта значыць зьвеньневым парадкам.

Нашы калгасьнікі прасілі перадаць зьезду, што наш калгас здасьць першым збожжа дзяржаве.

Няхай жыве камуністычная партыя!

Няхай жыве т. Сталін!

Няхай жывуць калгасьнікі-ўдарнікі, якія ня цягнуцца ў хвасьце, а ідуць уперадзе! (Воплескі).

Дэлегацыя піянэраў Біра-Біджана, якая вітала другі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў.

ЧЫРВОНЫМ АБОЗАМ СА ЗБОЖЖАМ

перад дзяржавай — справа гонару кожнай калгасьніцы

ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Хочам каб наш калгас быў першым

БОБРЫК ФЯДОСЬСЯ

Таварышы калгасьнікі і калгасьніцы, дазвольце вам перадаць шчырае прывітаньне ад раённага зьлёту Асіпавіцкага раёну (воплескі).

Я калгасьніца-бяднячка жыву ўжо ў калгасе 5-ты год, працую на калгасных сацыялістычных палёх. У нас калгас калі арганізаваўся быў зусім маленькі— з 10 гаспадарак. Потым арганізаваўся калгас па суседзтву. На агульным сходзе мы парашылі аб'яднаць гэтыя калгасы і на сёнешні дзень мы маем 75 гаспадарак. З сяўбою мы спазьніліся на 3 дні супроць таго тэрміну, які дала нам дзяржава. Цягавая сіла ў нас была аслабшай таму, што мы не бераглі яе. Мы парашылі паправіць сваю цягавую сілу, палепшылі догляд, насеялі кармовых і нават перавыканалі плян.

Зараз я скажу адносна праполкі. Калі я прыехала на раённы зьлёт, у нас праполка была праведзена на 100 проц. Жанчыны прапалолі збожжавыя культуры два разы. Гароды і проса таксама па два разы. Да нас з раёну прыяжджала жанчына і праводзіла сярод калгасьніц масавую работу ў часе праполкі. Усе жанчыны ў нашым калгасе былі разьбіты на тры брыгады. Брыгада № 2 адставала. Я маю 50 год, працую на цялячай фэрме, даглядаю 80 цялят. Калі я ўбачыла, што брыгада № 2 адстае, я папрасіла праўленьне, каб мяне паслалі ў гэту брыгаду, я там наладзіла работу і яна скончыла праполку сваячасова.

Як мы гатовы да ўборачнай? У нас да ўборачнай ужо адрамантаваны жняркі і касілкі, адрамантавана 40 гумнаў. Да кожнай брыгады прымацавана пэўная колькасьць гумнаў.

У нас таксама вылучаны два вартаўнікі, якія ахоўваюць уночы пасевы на полі. Таксама ёсьць спэцыяльны вартаўнік каля стайні і кладоўкі.

Мы пабудавалі ў сваім калгасе стайню, цялятнік, трусатнік, дзіцячыя ясьлі, пляцоўку, сталоўку і сіласную вежу.

Жанчыны ўсе працуюць, бо ім ужо ёсьць дзе пакідаць сваіх дзяцей. У ясьлях—35 дзяцей, а на пляцоўцы—20. Цяпер працаваць значна лягчэй, ня тое, як мне прыходзілася калісьці. Я ўжо 20 год удава, гадавала двое дзяцей, цяжка было, мне прыхо-

т. Бобрык Ф.

дзілася заўсёды ў поле браць іх з сабой. Зараз мне 50 год, працую ўдарна, 4 разы прэміявана (воплескі), у мінулым годзе выпрацавала 320 дзён, у гэтым годзе 155 дзён. Зараз думаю наладзіць работу сярод жанчын, каб наша жанчына прымала ўдзел ва ўсіх работах.

Нельга пахваліцца і сказаць, што мы, жанчыны, усё зрабілі і добра зрабілі. Гэтага нельга сказаць. А чаму? Таму, што наша жанчына яшчэ ня ўцягнута ў грамадзкую работу. Калі наша жанчына будзе прымаць актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці, мы сябе, жанчыны, апраўдаем.

Мы правялі сход калгасьнікаў і пастанавілі ўбраць сваячасова сенажаць, таксама ўсю ўборку правесьці за 17 дзён і здаць у першую чаргу дзяржаве збожжа, прычым здаць з першага абмалоту. Мы пастанавілі зжаць за 7 дзён і гэта выканаем.

Клічаўскі раён нас выклікаў на сацспаборніцтва. Мы яго, зразумела, абагналі і ў часе веснавой пасеўнай кампаніі і зараз па праполцы. Даю тут на зьезьдзе вам сваё шчырае слова, што абгонім гэты раён у загатоўках. Мы датэрмінова выканаем загатоўкі. Мы далі свайму калгасу імя тав. Гікало—хочам, каб наш калгас, калгас імя тав. Гікало, быў першым калгасам.

Мы здалі дзяржаве мясазагатоўкі на 100 проц., выканалі плян па лесавывазцы на 100 проц., здалі малако на 80 проц., падпісаліся на пазыку другой пяцігодкі на 2 800 р. і запэўніваю вас, дарагія таварышы, і даю сваё шчырае слова, што мы здамо дзяржаве збожжа ў першую чаргу.

У мяне два сыны. Абодва ў Чырвонай арміі, адзін пашоў дабраахвотнікам, другі па сваіх гадох. Я вельмі задаволена, калі ўбачыла, што мой сын прыехаў як ударнік на наш раённы зьлёт (воплескі). Калі ён пайшоў у Чырвоную армію, я яму сказала: змагайся, мой сынок, у Чырвонай арміі за ахову нашых межаў, каб да нас ворагі не дакапаліся, змагайся так, як я змагалася на нашых калгасных палёх.

Няхай-жа жывуць нашы калгасьнікі-ўдарнікі!

Няхай-жа жывуць нашы калгасьніцы-ўдарніцы!

Няхай жыве камуністычная партыя!

Няхай жыве тав. Сталін!

Няхай жыве тав. Гікало, імя якога ўзялі мы для нашага калгасу!

Вялікая сіла

(На зьлёце калгасьніц-ударніц Менскага р.).

„А лявоніха ня жонка была і нямытую кашулю дала", вырываюцца ў адчыненыя вокны на вуліцу вясёлыя словы жартаўлівага сьпеву, трэлі гармошкі, дробны тупат абсацаў.

Весела ў клюбе Камасьветы. Лепшыя з лепшых упяршыню сабраліся тут сьвяткаваць сваю перамогу на фронце барацьбы за бальшавіцкую сяўбу.

Адчыніўся зьлёт. Не пазнаць тых, хто за хвіліну перад гэтым скакаў і жартаваў. На лаўках сядзяць заклапочаныя, сур'ёзныя, са сшыткамі і алоўкамі ў руках. Падводзяць вынікі барацьбы за бальшавіцкую сяўбу, выяўляюць недахопы ў ходзе прапалачнай, правяраюць, хто як рыхтуецца да ўборачнай.

„Шчыра вітаю зьлёт ад калгасьніц к-су „Чырвоны партызан"—сьмела пачынае з трыбуны калгасьніца Вашчавоз. Мы арганізавалі ў гонар зьлёту маленькі чырвоны абоз—34 пуды збожжа, 11 літраў малака і трохі масла. Пяць год я працую ў калгасе. Цяжка было нам спачатку. Многія сяляне ня верылі, што ў калгасе будзе лепш, чагосьці чакалі, сваіх турбот да калгаснай маемасьці, да калгаснай справы не праяўлялі, як быццам з боку наглядалі—ці будзе ў калгасе лепш, чым у аднаасобнай гаспадарцы. Кулакі выкарысталі гэту нашу бястурботнасьць і разьвілі сваю шкодніцкую работу. Шмат коняй згубілі—не кармілі іх, трымалі ў брудзе. У мінулым годзе засеялі 12 *га* гароднінай, але атрымалі гародніну толькі з 2 *га*, бо не прапалолі, усё зарасло зельлем. Зараз ад кулакоў калгас ачысьцілі, з гультаямі вядзем бязьлітасную барацьбу, усе жанчыны ў нас, нават і старыя, прымаюць удзел у палявых работах. У гэтым годзе мы засеялі 17 *га* гародніны, усё прапалолі ўжо два разы. Да ўборачнай падрыхтаваліся—хоць зараз выяжджай у поле. Зьбярэм ураджай і першы абмалот здамо дзяржаве".

З зацікаўленасьцю пытаюць усе дэлегаткі ў часе перапынку і абеду дэлегатак Трасьцянецкага сельсавету, як гэта яны раней і лепш за ўсіх скончылі сяўбу і праполку, лепш за ўсіх падрыхтаваліся да ўборачнай. Прыклад бальшавіцкай самакрытыкі паказала тав. Ярашэвіч, Самахвалавіцкага сельсавету.

— Я чую,—пачала яна,—некаторыя калгасьніцы толькі хваляць свае калгасы, але нічога не гавораць аб недахопах. Нам сорамна гэтак рабіць, пра дрэннае трэба больш гаварыць, трэба бязьлітасна ўскрываць усе хваравітыя бакі нашага жыцьця.

Падрабязна спыняецца яна на ўсіх недахопах свайго калгасу, асабліва на рабоце дзіцячых ясьляй. Аб ясьлях на зьлёце гаварылася шмат. У большасьці калгасаў Менскага раёну ясьлі працуюць дрэнна. Вельмі мала ўвагі аддаюць ясьлям сельсаветы, праўленьні калгасаў, раённыя камітэты і Чырвоны крыж.

Надзвычай горача, па-братэрску віталі зьлёт прадстаўнікі заводу імя Варашылава—работніца Васілевіч і рабочы Голубеў.

Зьлёт паслаў прывітальныя тэлеграмы т. т. Сталіну, Гікало і Крупскай.

Усе выступленьні сьведчылі аб тым, што мацнеюць калгасы, а разам з імі мацнее і становішча калгасьнікаў. Калгасьніца Няцеўская з калгасу „Новы быт" гаворыць:

Толькі 34 гаспадаркі засталося ў нашай вёсцы па-за калгасам. Думаю, што гэту восень яны абавязкова будуць у калгасе. Ураджай у гэтым годзе вельмі добры ня бог нам дапамог, а самі мы зараз ведаем, як змагацца за высокі ўраджай і калгасны лад стварыў нам усе магчымасьці, каб атрымліваць нябывалыя да гэтага часу ўраджаі.

Калгасьніца калгасу імя N-ай Самарскай дывізіі Каладбінская Сабіна, былая бяднячка пра сваё жыцьцё расказвае так:

— Было ў нас 8 душ сям'і і 3 *га* нікуды нявартай зямлі—балоты ды пяскі. Зараз у калгасе па-ўдарнаму працую разам з мужам і мы лічым сябе ўжо моцнымі сераднякамі. У мінулым годзе мы выпрацавалі больш, чым 600 працадзён. Маем карову, сьвіней. Уся сям'я абута і адзета, старшыя дзеці вучацца, маленькія ў ясьлях. Вось чаму я, ня гледзячы на тое, што маю 6 дзяцей, ніколі не раблю прагулаў. Усе жанчыны мяне паважаюць. Ні адна ня пойдзе з поля, пакуль не пайду я.

Дэлегаткі Менскага раённага зьлёту калгасьніц-ударніц з Трасьцянецкага сельсавету Дзятко Зося, Корзун Рэня, Дамашэвіч і Паўлюц Каця.

„У часе сяўбы,—сказаў перад закрыцьцём зьлёту сакратар Менгаркому КП(б)Б т. Кудзелька,—калгасная практыка яшчэ раз пацьвердзіла тое, што жанчына ў калгасе—вялікая сіла. Прыехаўшы ў калгас, вы ні на хвіліну не павінны забываць аб гэтых словах правадыра партыі. Змагайцеся за тое, каб гэта сіла цалкам была пушчана ў справу. Змагайцеся за вылучэньне жанчын-калгасьніц на кіруючую працу. Стварэце добрыя дзіцячыя ясьлі, сады, пляцоўкі, каб усім жанчынам даць магчымасьць прымаць удзел у калгаснай вытворчасьці. Пры вашым энэргічным актыўным удзеле мы хутчэй зможам выканаць лёзунг партыі: „Ператварыць калгасы ў сапраўды бальшавіцкія, зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі".

Пад гучныя воплескі зьлёт прыняў адозву да ўсіх калгасьнікаў і калгасьніц Беларусі.

Сямёнава

Шырока разгорнем сацспаборніцтва паміж брыгадамі, зьвеньнямі, паасобнымі калгасьніцамі і дэлегацкімі сходамі на лепшае правядзеньне ўборкі і датэрміновае выкананьне загатовак

З самаабавязацельстваў другога зьлёту калгасьніц-ударніц Аршанск. р-ну

Праполка ўжо пачалася. Вопыт паказаў, што адсутнасьць правільнай арганізацыі працы на праполцы (работа гуртам, цэлымі брыгадамі на адным вучастку, а, значыць, і ўраўнілаўка, адсутнасьць магчымасьці арганізаваць групавое і індывідуальнае спаборніцва) адбіваецца як на тэмпах, так і на якасьці работы. Вось чаму мы патрабуем ад праўленьняў сваіх калгасаў:

1) Арганізацыі невялікіх зьвеньняў з 3—5 чал.

2) Вылучэньня ў палявых брыгадах калгасьніц-групаводаў, зьвеньневых сыгналізатараў з лепшых калгасьніц ударніц.

На брыгадных групаводаў ускласьці правільную зьвеньневую расстаноўку сіл у брыгадзе, улічваць якасьць праполкі, прымаць удзел пры прыёмцы работ, разгортваць міжзьвеньневае і брыгаднае спаборніцтва і ўдарніцтва, рашуча даючы адпор усялякім кулацкім спробам сарваць работу ў калгасе па праполцы, касьбе, уборцы.

Зьвеньневыя сыгналізатары дапамагаюць ва ўсёй працы групаводам брыгад, сыгналізуюць аб засьмечанасьці асобных вучасткаў поля пустазельлем, аб сьпеласьці збожжа для жніва і г. д.

Мы абавязваемся правесьці сваячасовую праполку каласовых да выхаду ў трубку, прапалоць лён і канопліі два і тры разы, праполку кораньплодаў і іх прарэджваньне, пульхненьне праводзіць два разы, а гароднія культуры тры разы, прычым не пазьней 2—3 дзён пасьля праполкі гародаў і кораньплодаў, праводзіць абавязковае пульхненьне, акучваньне міжрадзьдзяў. Усякі раз пасьля акучваньня бульбы мы будзем вылучаць спэцыяльныя зьвеньні калгасьніц, якія павінны будуць хадзіць за акучваньнем з матыкаю і засыпаныя памятыя сьцяблы і кусты бульбы папраўляць, сачыць за правільным яе ростам.

Пачалася касьба, падыходзіць уборка, мы бярэм на сябе абавязак улічыць наяўнасьць у калгасах грабель, сярпоў і ўборачнага інвэнтару і на другі дзень пасьля нашага прыезду дамоў прымацаваць увесь інвэнтар да калгасьнікаў. Не дапусьціць, каб гэты інвэнтар прымацоўваўся ў няспраўным выглядзе. Мы абавязваемся праз сваіх зьвеньневых сыгналізатараў дапамагаць праўленьню і сачыць за высьпяваньнем невялікіх вучасткаў і пачынаць жаць, не чакаючы сьпеласьці ўсяго поля.

Мы, калгасьніцы-ўдарніцы, абавязваемся да пленуму Цэнтральнага Камітэту партыі (15 га ліпеня) скончыць поўнасьцю касьбу, апрача таго мы патрабуем ад праўленьняў нашых калгасаў арганізаваць начлег на адлеглых сенажацях, грамадзкае харчаваньне ў полі. На варочаньні і зграбаньні сена практыкаваць групавую (8—10 чалавек) зьдзельшчыну, а на жніве—зьвеньневую з абавязковым улікам (з дапамогай брыгадных групаводаў) праробленай працы кожнай групай, зьвяном за дзень, ставячы ў ведама штодзенна аб выніках работы ўсе брыгады. Мы абавязваемся аказваць усямерную дапамогу калгасам, якія маюць малую колькасьць рабочай сілы і сенажаць у адлеглых мясцовасьцях.

У мэтах барацьбы са стратамі мы бярэм на сябе абавязацельствы:

1) Правесьці жніво жыта, ячменю, пшаніцы за 8—10 дзён, аўса—за 10 дзён.

2) Сачыць за добраякаснай вязкай снапоў, за тым, каб ні адзін колас не застаўся ў полі і, улічваючы важнасьць добраякаснай вязкі, састаўляць снапы ў „бабкі".

3) У мэтах лепшага захаваньня ільнавалакна, уборку ільну распачаць са зьяўленьнем жоўтай сьпеласьці і ні ў якім выпадку не дапускаць перастою ільну. Зараз-жа пасьля прасушкі снапоў арганізаваць абмалот і неадкладны расьсьціл і мочку ільну. Мы абяцаем, што сярод нас, жанчын-калгасьніц, ня будзе ніводнай прагульшчыцы, мы будзем працаваць ад цёмнага да цёмнага, каб усю ўборку ўраджаю выканаць у прынятыя намі тэрміны.

4) Мы бярэм на сябе абавязак—мабілізаваць усіх калгасьніц на збор і рамонт неабходнай колькасьці мяшкоў і падрыхтоўку складзкіх памяшканьняў з тым, каб забясьпечыць сваячасовы прыём збожжа з-пад малатарань. Мы патрабуем ад праўленьняў калгасаў неадкладна арганізаваць каравульныя каманды для аховы нашага сацыялістычнага ўраджаю. Мы першыя пойдзем у гэтыя каманды для аховы нашага дабра ад клясавых ворагаў, ад раскрадваньня.

Усю гэту работу мы правядзем пад лёзунгам: „Наш ганаровы і першачарговы абавязак здаць збожжа дзяржаве з першага абмалоту, закончыць збожжапастаўкі дзяржаве да 20-га верасьня і бульбу—да 5-га кастрычніка.

5) За гэты час вылучыць ня менш 15 лепшых калгасьніц-ударніц на кіруючыя работы ў калгасах.

6) Мы бярэм абавязак палепшыць становішча і работу ўжо існуючых 150 ясьляй, пляцовак, дабіцца арганізацыі ва ўсіх калгасах дзіцячых устаноў на час праполкі і ўборкі ўраджаю.

Вось нашы першачарговыя задачы, за ажыцьцяўленьне якіх мы будзем змагацца ўдарна. Працуючы, будзем пільна сачыць за клясавай чыстатой нашых калгасаў, рашуча ачышчаючы іх ад кулака, жуліка, лодыра і прагульшчыка.

Нас калгасьніц заклікаў т. СТАЛІН берагчы калгасны лад, як сваё вока. Справай гонару для нас зьяўляецца адказ на гэты заклік нашага правадыра, лепшага ўдарніка т. СТАЛІНА, ударнай бальшавіцкай работай.

Мы гэта дакажам ударнай работай, бальшавіцкімі справамі.

Па даручэньні зьлёту калгасьніц-ударніц—
ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЛЁТУ.

Дашкольныя ўстановы паставім на службу ўборачнай

Выкананьне лёзунгу партыі зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў—заможнымі залежыць ад таго, як мы справімся з правядзеньнем чарговых гаспадарча-палітычных кампаній на сяле. Надыходзячая ўборачная кампанія вырашае посьпех сельскагаспадарчага году. Яна патрабуе найбольшай мабілізацыі ўсіх вытворчых і людзкіх сіл.

Дашкольныя ўстановы ў калгасах, саўгасах, МТС зьяўляюцца адным з важнейшых сродкаў, якія дапамагаюць мабілізацыі людзкіх сіл і даюць магчымасьць працоўнай сялянцы і калгасьніцы ўдарна, нароўні з мужчынай, убіраць сацыялістычны ўраджай. Вось чаму далейшае разгортваньне і замацаваньне сеткі дашкольных устаноў на час праполачнай і ўборачнай кампаніі ў кожным калгасе, кожным саўгасе павінна стаць баявой апэрацыйнай задачай кожнага райАНА, кожнага сельсавету, кожнага старшыні калгасу.

Мы ўжо маем на 5-VII у сацыялістычным сэктары вёскі адкрытых 3325 пляцовак з ахопам 87.853 дзяцей, што складае 95 проц. пляну. Побач з такімі раёнамі, якія па-бальшавіцку змагаюцца за выкананьне пляну, як Полацак, Ворша, Слуцак, Дзяржынск, Брагін, Быхаў, Вузда, мы яшчэ маем і адстаючыя раёны, як Чырвонапольле—15 проц., Расоны—28 проц., Пятрыкоў—35 проц., Асіпавічы—44 проц.

Яшчэ мае месца апартуністычная недаацэнка дашкольнай справы з боку асобных раённых арганізацый і сельсаветаў. Так, сельскія саветы Прыборскі, Клімаўскі, Кармянскі, Сяброўскі (Гомельшчына), Горацкі, Астроўшчынскі (Полаччына), Астрашынскі, Бынавіцкі (Лельчыцы) упарта змагаліся, каб іх не турбаваць пляцоўкамі. Вушацкі раён адмовіўся выдаваць са складу пасуду, патрабаваў ад калгасаў за пасуду хлеб. Такое-ж змаганьне мы мелі з боку дырэктароў саўгасаў Быхаўскага і Жлобінскага раёнаў (саўгасы Весялова, Прыяміна, Леніна). Загадчык райАНА Асіпавічы т. Кенька разважае: „Адкрыць павінны 25 устаноў, адкрылі 10, ці працуюць яны—ня ведаю". У Ясенскім сельсавеце на працягу некалькіх месяцаў ужо зачынен сталы дзіцячы ачаг, але гэтага ня ведае Кенька.

Старадароскія горад-кіраўнікі праглядзелі, што ў раёне вялася кулацкая агітацыя супроць дзіцячых устаноў—дзяцей 4—8 год запалохвалі, што іх у яслях аддадуць коням, што ўсе дзеці абавязкова перамруць. Недаацаніў справы дашкольнага выхаваньня на сяле і Наркамфін, які не забясьпечыў сваячасовага фінансаваньня гэтых устаноў у раёнах, сельсаветах, дзе выдачу грошай пляцоўкам ставяць у залежнасьць ад мабілізацыі сродкаў.

Усе гэтыя факты павінны мабілізаваць пралетарска-калгасную грамадзкасьць на рашучы паварот тварам да працы дашкольных устаноў на сяле, стварыць ім належныя ўмовы працы. Мы павінны дабіцца такой пастаноўкі работы пляцоўкі, каб яна ня толькі вызваляла калгасьніц ад клопатаў аб дзецях, але і зьяўлялася магутным сродкам прапаганды ідэй камуністычнага выхаваньня.

Пляцоўка павінна забясьпечыць абслугоўваемаму дзіцяці фізычнае аздараўленьне, прышчапленьне асноўных санітарна-гігіенічных навыкаў, даць яму камуністычнае выхаваньне, элемэнты антырэлігійнага і інтэрнацыянальнага выхаваньня, прасьцейшае паняцьце аб наўкольным жыцьці.

У кожным калгасе ёсьць магчымасьць даць пляцоўкам лепшыя з былых кулацкіх будынкаў. Калгасная майстэрня можа зрабіць абсталяваньне. Праз арганізацыю ініцыятывы калгаснай грамадзкасьці можна забясьпечыць харчаваньнем.

Неабходна зараз пры разьмеркаваньні ўраджаю самім калгасам дабіцца выдзяленьня спэцыяльных фондаў для забесьпячэньня пляцовак харчовымі фондамі на будучы год.

Загадчыкі райАНА павінны патрабаваць ад кожнай выхавальніцы выкананьня аздараўленчага і выхаваўчага мінімуму працы. Дашкольніцы гарадоў і раённых цэнтраў у парадку шэфства павінны дапамагчы ў працы калгаснай пляцоўцы і несьці адказнасьць за яе работу.

Вядучы ўпартае змаганьне за высокую якасьць працы калгаснай пляцоўкі, райАНА павінна патрабаваць ад кожнага калгасу замацаваньня пляцоўкі і на зіму. Ня менш 50 проц. сеткі павінна быць замацавана. Гэтага мы патрабуем ад кожнага райАНА, кожнага праўленьня калгасу, кожнага дырэктара саўгасу. Дашкольныя ўстановы павінны арганічна ўвайсьці ў новы быт, вызваліўшы калгасьніц ад клопатаў аб дзецях ня толькі ў часе сяўбы і ўборачнай, але-ж і на працягу ўсяго году, павінны таксама забясьпечыць камуністычнае выхаваньне новага пакаленьня.

Гіндзіна.

Куток прыроды ў 8 дзіцячым ачагу (г. Менск).

Адкрыць яслі да ўборачнай

Яслі ў часе веснавой сяўбы, праполкі і ўборкі адыгрываюць вельмі вялікае значэньне. У сваёй пастанове ад 25 мая „Аб рабоце сярод калгасьніц і работніц саўгасаў“ у сувязі з праполачнай кампаніяй ЦК КП(б) Б абавязаў усе кіруючыя арганізацыі раёнаў, а ў першую чаргу—партарганізацыі, забясьпечыць поўнае адкрыцьцё прадугледжаных плянам ясьляй і пляцовак, але па Полацкім раёне гэта пастанова ня выконваецца.

Прадугледжаныя па пляну яслі зусім не адкрыты ў Семянецкім, Бельскім і інш. сельсаветах. У калгасе імя Сталіна (М.-Сітнянскага сельсавету) брыгадзір Цыганкоў і калгасьніца Маньякова на работу ў поле хадзілі з малымі дзецьмі, бо дома іх ня было каму даглядаць. У гэтым калгасе яслі адкрыты ня былі толькі таму, што старшыня калгасу Дзюбанаў адмовіўся выдаць прадукты і малако.

Прысланая на пасаду загадчыцы ясьляй тав. Іванова доўга хадзіла без работы па калгасе і прасіла ў Дзюбанава дапамогі ў справе арганізацыі асьляй, але ніякія просьбы не дапамаглі.

Загадчыца ясьляй калгасу „Бальшавіцкі заклік“, гэтага-ж сельсавету, таксама некалькі тыдняў хадзіла па калгасе беспрацоўнай, бо яслі ні прадуктамі, ні абсталяваньнем забясьпечаны ня былі. Старшыня сельсавету Сундукоў лічыў, што дапамагаць у рабоце яслям не яго справа.

Калгас „Новы шлях“, Верхачэўскага сельсавету, скончыўшы сяўбу, зачыніў яслі, ня гледзячы на тое, што жанчынам патрэбна было хадзіць на праполку. У калгасе „Дзядуны“, Сосьніцкага сельсавету, загадчыца ясьлямі ходзіць на праполку, а яслі зачынены.

Працуючыя ў раёне ясьлі слаба наведваюцца дзецьмі з прычыны дрэннага догляду. Па пляне ў ясьлі пры калгасе „Чырвоны сьцяг“, Баярскага сельсавету, павінна хадзіць 35 дзяцей, а ходзіць усяго толькі 20—25. Як-жа загадчыца ясьлямі і нянькі даглядаюць гэтых дзяцей? У ясьлях ніякіх цацак няма. Дзеці бяз догляду бегаюць па гародах, каля рэчкі і наогул там, дзе ім уздумаецца. Загадчыца ясьлямі Шкрэдава больш сьпіць і гуляе, чым даглядае даручаных ёй дзяцей. Ні праўленьне калгасу, ні сельсавет у адносінах работы ясьляй ня прымаюць ніякіх захадаў.

Ёсьць у гэтым калгасе 18 дзяцей дашкольнага ўзросту, але пляцоўка не адкрыта.

Працуючыя ў раёне пляцоўкі прыладамі не забясьпечаны. У калгасе „Першамайскія захарнічы“, Грамадаўскага сельсавету, дзеці дашкольнага ўзросту бегаюць каля коняй або капаюцца ў гразі. Мэдыцынскага нагляду ў ясьлях няма.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што ў Полаччыне з боку паасобных старшынь калгасаў і сельсаветаў ясьлям аддаецца вельмі мала ўвагі. Вінаватыя ў зрыве ясьляй і пляцовак і ў дрэнным доглядзе дзяцей павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Райздраў і райза павінны дабіцца таго, каб усе прадугледжаныя плянам яслі і пляцоўкі былі адкрыты і забясьпечаны прадуктамі і прыладамі, каб якасьць іх працы была ўзьнята на належную вышыню. Ад працы дзіцячых устаноў у значнай ступені будзе залежаць посьпех правядзеньня ўборачнай.

Канавалаў.

Полацкі раён.

Пра апартуністычныя разважаньні райза і зрыў пляну

Пастанова ЦК і СНК БССР аб адчыненьні дзіцячых устаноў у калгасах і саўгасах Лоеўскімі раённымі кіруючымі арганізацыямі ня выконваецца. Замест 36 ясьляй і 16 пляцовак адкрыта толькі 28 ясьляй і 1 пляцоўка. У невыкананьні пляну „актыўна дапамагае“ сам заг. райза тав. Доўгі. Старшынь калгасаў ён нават спыняе: „Не сьпяшайцеся з адчыненьнем ясьляй, яшчэ пара не гарачая“—так ён гаварыў т. Нізаўцову—старшыні калгасу імя Калініна. Райза, бачыце, зусім ня горача і ня холадна ад таго, што ў калгасе імя Калініна № 2 жанчыны ня выходзяць на работу з-за адсутнасьці ясьляй і праполка зрываецца.

Прытрымліваючыся сваёй устаноўкі, сам райза не сьпяшаецца, гледзячы на яго, не сьпяшаецца райздраў і райжанорг. Дакладнага уліку ясьляй і якасьці іх працы па раёне няма.

Ад раённых кіраўнікоў перанялі гэтыя апартуністычныя настроі і паасобныя кіраўнікі калгасаў. Член праўленьня кандыдат партыі т. Рабчынкоў з калгасу „Чырвоная гара“ разважае: „Яслі? А што дзеці ў ясьлях есьці будуць? Харчовага фонду няма“. А бульба, якая ёсьць у калгасе, забраніявана за сьвінфэрмай. Няўжо Рабчынкоў забыўся, што цяпер лета, травы хоць завaліся, адгону таксама хапае, так што бульбу можна бяз усякага ўрону аддаць на харчаваньне ясьляй. Калі яму, як партыйцу, аб гэтым гавораць, ён адмаўляецца. „Чаго мне клапаціцца, я-ж не старшыня, няхай старшыні аб гэтым галава баліць“. Не баліць галава ў члена праўленьня калгасу т. Рабчынкова і аб тым, што толькі 80 проц. жанчын выходзяць на работу, астатнія з дзецьмі сядзяць дома. Нават жонка самога Рабчынкова на працу зусім ня выходзіць.

Яшчэ горш стаіць справа ў калгасе „Чырвоны авангард“, але аб гэтым ня ведае ні райза, ні райздраў. Жанчын на працу выходзіць толькі 40 проц. Расьсьледвалі прычыны нявыхаду, аказалася, што 30 проц. ня выходзяць на работу выключна з прычыны адсутнасьці ясьляй і пляцовак. Астатнія 30 проц. зьяўляюцца прагульшчыкамі. Само праўленьне займаецца папойкамі, разважаньнямі і яму зусім „няма часу“ займацца праполкай і ўборкай.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычных разважаньнях аб тым, што рана і немагчыма адкрыць дзіцячыя ўстановы. Рашэньні партыі і ўраду аб адчыненьні ясьляй і пляцовак павінны быць неадкладна выкананы.

Таня.

Галоўнае—барацьба за якасьць

Менская абутковая ф-ка імя Кагановіча за час свайго існаваньня мела шмат посьпехаў у справе выкананьня прамфінпляну.

Асноўны недахоп ф-кі—гэта няўменьне замацоўваць посьпехі, няўменьне арганізаваць масы на штодзеннае выкананьне пляну. У выніку ф-ка ня выходзіць з прарыву як па колькасных, так і па якасных паказальніках. Адхіленьне ад першага гатунку па пляну вызначана на 1933 год у 10 проц., а ф-ка дала ў студзені 15,57 проц., у чэрвені—20,49 проц. пры колькасным выкананьні прамфінпляну ў 89 проц.

Вялікую ролю ў выкананьні прамфінпляну, у барацьбе за якасьць адыгрываюць на нашай ф-цы работніцы, колькасьць якіх дасягнула 60 проц. Мы маем работніц перадавікоў, герояў першай пяцігодкі (Аляксеева, Юдзялевіч), работніц, вылучаных за ўдарную работу майстрамі (Санташова), кантралёрамі (Шырко, Каган, Чарапахіна, Рыпс), закройшчыц, якія перавыконваюць прамфінплян (Паўлава).

Ёсьць ударныя брыгады работніц, якія зьяўляюцца лепшымі брыгадамі ф-кі. Прыкладам можа быць брыгада брусаўшчыц імя 8-га сакавіка. На чале гэтай брыгады стаіць герой пяцігодкі тав. Юдзялевіч. Брыгада складаецца з 4-х чалавек, усе яны прэміяваны за добрую работу на вытворчасьці: Юдзялевіч—тры разы, Гладун—два разы, Пінхусевіч—адзін раз, Левіна—адзін раз. Брыгада сыстэматычна перавыконвае прамфінплян. Выкананьне пляну дасягаецца ўпартай барацьбой і адданасьцю сваёй рабоце кожнай ударніцы ў пасобку. Гэта ўдарная работа брусаўшчыц кідаецца ў вочы кожнаму, хто заходзіць у закройны цэх. Чыстыя і прыгожыя брусавальныя машыны гавораць аб тым, што яны маюць добрага гаспадара. Калі раней гэтыя машыны амаль штодня рамантаваліся, дык зараз яны зусім не патрабуюць рамонту; акуратны догляд машыны дае бесьперабойнасьць у яе рабоце. Дзякуючы беражлівым адносінам і акуратнай точцы, нажы замест 6 месяцаў па пляну працуюць на працягу году і больш. Брыгада эканомна скарыстоўвае кожны кавалачак пасаў.

Галоўнае пытаньне, якое зараз стаіць у брыгадзе—гэта барацьба за якасьць, змаганьне за права рапарту на парткан-фэрэнцыі ўдарнікаў якасьці.

Быў час, калі брусаўшчыцы па якасьці брусоўкі мелі няўстойлівае становішча, і ў першым квартале ў брыгаду быў пастаўлен кантроль, у той час, калі па пляну цэху гэтага кантролю не павінна быць. Сорамна стала брыгадзе, і пачала яна пабальшавіцку змагацца за якасьць. Кожны з брыгадзіраў кантралюе работу сваю і сочыць за другімі, усе адказваюць за аднаго і адзін за ўсіх. Зараз кантроль зьнят, брыгада не прапускае ні аднэй дэталі браку ня толькі са свайго, але і з папярэдняга працэсу.

За апошні час замест 28 дэталяй браку на 12.480 пар, які дапускаецца па пляну, брыгада дае ад 8 да 12 дэталяй на 15.000 пар. Брыгада вядзе дзеньнік прагулаў і спазьненьняў, дакладны ўлік штодзеннага вырабу кожнага з брыгады.

Высокіх паказальнікаў па якасьці брыгада дасягае выпрабаваным ленінскім мэтадам сацспаборніцтва. Юдзялевіч спаборнічае з Гладун і Пінхусевіч, Гладун—з Левінай.

Недахопам зьяўляецца тое, што брыгада ня мае формы для ўліку масла, пасаў і нажоў. Плянавы аддзел усё абяцае даць форму, але не дае, не дае магчымасьці яшчэ больш разгарнуць барацьбу за эканомію матар'ялаў.

Брыгада Юдзялевіч зьяўляецца гонарам ф-кі. Аднак, вопыту яе работы, яе гераізму ф-ка не перадае туды, дзе стаяць работніцы бракаробы, якія яшчэ не зразумелі важнасьці барацьбы за вытворчыя пляны і сваёй штодзеннай працай паглыбляюць прарыў фабрыкі. Некаторыя работніцы з працэсу мазкі наскоў (машынны цэх), па віне якога ідзе найбольшае адхіленьне ад першага гатунку, замест вывучэньня працэсу кожны дзень просяцца ў майстара перайсьці на другую работу. Работніца новага канвэеру, аб якім многа пісала „Работніца і калгасьніца Беларусі", Расьцішэўская сыстэматычна робіць брак і нават імкнецца свой брак перакласьці на таварышоў па варштату, яна бракаваныя загатоўкі падкідае пад машыну. Работніца машыннага цэху Гарэцкая таксама бракароб, яна крыва кладзе падэшву і, ня гледзячы на ўсе заўвагі, ня хоча паляпшаць сваю работу. Работніца Альпяровіч—фальгістка не змагаецца за эканомнае выкарыстоўваньне скуры і глуміць дэфіцытную прадукцыю, раскідаючы яе направа і налева. Вось гэтыя работніцы бракаробы паглыбляюць прарыў фабрыкі, шкодзяць і перашкаджаюць фабрыцы выйсьці ў рады перадавых.

Грамадзкім арганізацыям ф-кі і асабліва жансэктару неабходна больш займацца пытаньнем перадачы вопыту лепшых брыгад, лепшых ударніц.

Трэба на гэтых канкрэтных прыкладах паасобных герояў вучыць работніц сапраўднай гераічнай барацьбе за ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі аб асваеньні новай тэхнікі, аб паляпшэньні якасьці працы.

Асаёнак.



З невялічкай майстэрні ў 1929 г. у 200 раб. Гомельская абутковая ф-ка „Праца" выросла ў буйнае мэханізаванае прадпрыемства з 1000 рабочых. На здымку машына для раскройкі кожы на гэтай ф-цы.

Каб партыйны молат лепш выкоўваў

На кушнернай фабрыцы ўсяго працуе 507 рабочых, з якіх 250 жанчын.

За гады першай пяцігодкі партыйная арганізацыя фабрыкі значна выросла. У 1929 г. тут было ўсяго 20 камуністаў, зараз іх 82. Пастанова ЦК УсеКП(б) аб чыстцы партыі ўзварушыла ўвесь працоўны калектыў фабрыкі. Гэту пастанову прапрацоўвалі па цэхах, групах, склікалі паасобныя нарады са старымі рабочымі, жанчынамі-ўдарніцамі, камсамольцамі, з прафактывам.

З чым жа падышла ф-ка да чысткі? Прамфінплян у цэлым па фабрыцы за першае паўгодзьдзе 1933 г. выканан па колькасных паказальніках на 100,1 проц. Аднак, плян паляпшэньня якасьці прадукцыі і зьніжэньня сабекошту, за выключэньнем кушнернага цэху, ня выканан, а па куртачным цэху за апошнюю дэкаду чэрвеня нават і па колькасных паказальніках прамфінплян выканан толькі на 70 проц. Падрыхтоўка да чысткі і самая чыстка, якая пачалася на гэтай фабрыцы 14-га ліпеня, выявіла ўсе прычыны гэтага адставаньня.

Здаровая ў асноўным партарганізацыя, якая выросла за лік лепшых ударнікаў-рабочых і рабогніц, мела, аднак, у сваіх радох і такіх, якія не маглі насіць ганаровую назву камуністаў. Парткіраўніцтва ф-кі не праявіла належнай клясавай пільнасьці. Да апошняга моманту рвачу-перараджэнцу **Рубіну** даручалася адказьнейшая работа закройшчыка і прыёмшчыка. Рубін шкодніцкі адносіўся да працы, псаваў сыравіну, прымаў дрэнную работу, як добрую. „Камуніст" Рубін паставіў сабе адну мэту—асаоістае ўзбагачэньне за кошт сумленнай працы другіх, за кошт пагоршаньня становішча фабрыкі. Да апошняга моманту ў партыі знаходзіўся таксама былы бандыт, кантрабандыст **Фэрдынанд**, які, працуючы на ф-цы, не пакінуў сваіх кантрабандысцкіх звычак. Парткіраўніцтва несвоечасова рэагавала на парушэньні партыйцамі працоўнай дысцыпліны, на антыпартыйныя выступленьні паасобных камуністаў (Баранава: „Не дасьцё бацінкі, запру ўваход на ф-ку").

„Трэба ўзброіць усю армію бальшавікоў вострай зброяй марксыцка-ленінскай тэорыі, якая дае практыкам сілу арыентоўкі, яснасьць пэрспэктывы і ўпэўненасьць у рабоце, веру ў перамогу нашай партыі". Гэтыя словы правадыра партыі т. Сталіна таксама былі забыты парткіраўніцтвам кушнернай. Партвучоба ня была наладжана. Школу і гурткі ня толькі беспартыйныя, але і камуністы наведвалі слаба. У выніку ўдарнікі, якія па некалькі раз былі прэміяваны, былыя ўдзельнікі грамадзянскай вайны, не змаглі адказаць на запытаньне праверачнай камісіі: „Чым адрозьніваецца Чырвоная армія ад арміі капіталістычнай. Якая канчаткова мэта камуністычнай партыі, чым адрозьніваецца ваша гаспадарча-разрахункова брыгада ад брыгады звычайнай і г. д. Слаба ўзброеныя тэарытычна, многія камуністы не зьяўляліся авангардам на вытворчасьці. Начальнік куртачнага цэху работніца **Хэйфэц** заяўляе: „У нас, у цэху, камуністы могуць склікаць вытворчую нараду, але ня могуць кіраваць гэтаю нарадаю, ня могуць весьці за сабою беспартыйных".

Па нацскладу рабочыя фабрыкі падзяляюцца на беларусаў—40 проц., яўрэяў—50 проц., апрача таго ёсьць украінцы, палякі і рускія. Ніякай работы па інтэрнацыянальным выхаваньні не вялося, у выніку сярод рабочых розных нацыянальнасьцяй наглядаецца грызьня, склокі. Паасобныя камуністы нават „узначальвалі" гэту грызьню (Баранава: „Вашым даяцё ўсё, а нашым нічога"). Ня гледзячы на тое, што 50 проц. усіх рабочых складаюць жанчыны, слаба была разгорнута работа дэлегацкага сходу і наогул палітвыхаваўчая работа сярод жанчын. Слаба ішло вылучэньне жанчын на кіруючую працу, хоць вылучэнкі—начальнік куртачнага цэху Хэйфэц, рэдактар шматтыражкі Цыркіна, і старшыня фабкому Беланоўская, былыя работніцы сваёй доораі работай даказалі неабходнасьць больш рашучага вылучэньня жанчын.

„Наша партыя ачышчае сябе для таго, каб стаць яшчэ больш баяздольнай, каб адтачыць сябе, каб партыйны молат лепш выкоўваў, каб наш апарат лепш працаваў, каб нашы гаспадарнікі лепш разьвіваліся, каб канцыляршчына і бюракратызм хутчэй зжываліся, каб рабочым масам і сялянству лепш жылося. Вось для чаго мы праводзім чыстку" (Кагановіч).

Пералом, які створан зараз на фабрыцы дзякуючы пачатку чысткі, бліскуча пацьвярджае гэтыя словы т. Кагановіча. Зараз вельмі ажывілася работа палітшкол і гурткоў. Павялічыліся рады ўдарнікаў, палепшылася работа гаспадарча-разрахунковых брыгад, паасобныя істужкі, як камсамольская, даюць прыклады ўзорнай па якасьці работы. Прамфінплян за чэрвень выканан на 103,2 проц. Паступленьне рацыяналізатарскіх рабочых прапаноў павялічылася за гэты месяц на 60 проц. супроць мінулага месяца. Палепшылася работа курсаў па павышэньні кваліфікацыі. Былыя падмятальшчыцы пасьля вучобы на гэтых курсах пастаўлены на работу каля варштатаў.

Чыстка значна ажывіла работу партыйнага калектыву.

К. С.

„Чыстка партыі яшчэ шчыльней згуртуе рабочыя і калгасныя масы вакол партыі, усіліць і ўмацуе партыйныя арганізацыі і зробіць іх яшчэ больш баяздольнымі ў ажыцьцяўленьні задач другой пяцігодкі".

ГПБ Сч.-Ад.

Андрэй Ушакоў.

Ганна Барзенкова.

(Нарыс пра героя першай пяцігодкі)

(П р а ц я г)

* * *

Выў агульны сход рабочых фабрыкі. Дырэктар рабіў справаздачу аб выніках працы першага кварталу. А са справаздачы тае нярадасныя весткі пачула Барзенкава—фабрыка набыла замежнае абсталяваньне, абсталяваньне апошняга слова тэхнікі. Тэхніка перарасла людзей. Рабочыя ня выконваюць плян. Шліфавальні і штампоўачны даюць багата запасу. Зборачны, дзе работа ў большасьці ручная, адстае. Неабходзен рашучы пералом у рабоце. І яшчэ ён казаў пра ўдарніцтва ды сацспаборніцтва, пра якое ўжо шмат у той час пісалі газэты. Барзенкава ніяк не магла ўцяміць, што-ж канкрэтнага ў гэтым напрамку можна зрабіць ва ўмовах свайго цэху. Увесь той вечар яна думала пра ўдарніцтва і спаборніцтва. Трывога, як цень, не адставала ад яе. Праглядала газэты, хапалася за артыкулы і, не знаходзячы поўнага адказу, не дачытаўшы, кідала і думала пра свой цэх. На яе партыя ўскладае надзею, а што яна зробіць у адказ, каб цэх вывесьці з прарыву. У пралетарскіх цэнтрах—у Маскве, Ленінградзе—над заводамі полымем вагранак шырылася і ўзрастала хваля энтузіязму, каб потым жывым агнём разьліцца па ўсёй рэспубліцы. Гэта мабілізаваўся пралетарыят, напружваў усе сілы на выкананьне пяцігадовага пляну.

— Хоць ты дэлегацыю ў Маскву пасылай, — гіранізавала яна сваю няўцямнасьць, там бы да кожнай драбніцы расказалі, што і як... І тут ўспомніла, што ў Маскве ў яе ёсьць знаёмая—інструктар зборачнага цэху машынабудаўнічага заводу.

У той вечар яна позна за поўнач сядзела і пісала дробным почаркам ліст да знаёмай. У ім было апісана становішча цэху і ўсе дэталі работы. Калі ўжо меркавала заклейваць ліст, разгарнула і зрабіла PS „глядзі-ж, не марудзь з адказам... дужа-ж яно запала мне ў сэрца. Ды так, як я табе, з усімі падрабязнасьцямі. Ды ведай, што не адна чакаю я адказу, чакае ўвесь мой цэх".

Скончыўшы працу, тлумачыла аднаварштатнікам:

— Скажам, на нашым стале 22 работніцы, то з іх складзецца адна брыгада і будзе яна называцца ўдарнай. Усе мы робім распэратары, кожная працуе паасобку ад пачатку да канца, даводзіцца аднэй выконваць усе працэсы. Марудная гэта справа і выпрацоўка няважная. А калі мы брыгаду на 5—6 працэсаў падзелім, кожная будзе ведаць толькі свой працэс, скажам, будзем прышываць зажымы і ўсё. Іншыя будуць на другім працэсе. Гэтым дасягнем большай выпрацоўкі, а значыць і грошай больш заробім. І сабе лепш і дзяржаве шмат прадукцыі. Калі-ж правядзем рацыяналізацыю, то і сабекошт можна зьнізіць. А каб, значыць, работа спарнейшай была, адна перад аднэй навыперадкі пойдзем. Хто больш выпрацуе, таму павага і гонар. Грошы ў канцы месяца падзелім на ўвесь калектыў—брыгады...



На чале з Барзенкавай стварылася першая ўдарная брыгада.

Таго-ж дня на чале з брыгадзірам Барзенкавай Ганнай стварылася на акулярнай першая ўдарная брыгада. Спачатку цяжка было, ня маючы вопыту арганізаваць рацыяналізацыю працэсаў і роўнамерна расставіць работніц, каб ня было так, што адны ад нагрузкі са скуры лезуць, а другія-б гультаявалі ды пасьмейваліся. Новы мэтад працы адразу даў сябе адчуваць; замест 260 распэратараў у дзень кожная работніца вырабляла 300—350. Пасьля першых дзён гарачай працы, пасьля першай палучкі (хоць кожная з іх цяпер больш атрымала, чым раней) Барзенкава адчула—у брыгадзе ня ўсё ладна. Адны работніцы шчыра працуюць, а другія робяць, нібы мокрае гарыць. Яны мяркуюць — можна павальней працаваць, усё адно заработак для ўсіх роўны. Сярод сумленных работніц расла затоеная маўклівая варожасьць. „За нашу працу гультаі грошы бяруць".

Прышлося памылку выправіць, пачаць выплату зьдзельна—хто колькі выпрацуе, столькі і атрымае. Зробіш брак, за яго і адказвай. Так быў наладжан пастаянны ўлік. Хто адстае—перад цэхам, на чорную дошку вывешвалі.

З першай брыгады пачалі браць прыклад і іншыя цэхі.

Ня зьмерыць тэй вялікай радасьці, якую адчула Барзенкава, калі яе за арганізацыю брыгады

і работу ў ёй прэміявалі граматай ганаровага ўдарніка і 200 руб. Яна тады адчула, як высока цэніць краіна людзей, што стаяць на перадавых пазыцыях сацбудаўніцтва.

* * *

Кожнай раніцы Барзенкава пакідае дачке наказ:

— Сёньня мне часу няма. Да адыходу ў школу глядзі ў хаце, прыпарадкуй сама.

Дома рэдка бывае. Кожную сваю вольную хвіліну на фабрыцы. Яна неразлучна зжылася са сваім цэхам, з яго штодзеннымі будзённымі клопатамі. І сапраўды, у яе столькі нагрузак: член гарКК, член ЦКК, старшыня цэхкамітэту, загадчык сацбытавога сэктару. Патрэбна столькі творчага запалу, каб быць першай, каб нідзе ня схібіць.

Рабочыя ведаюць яе прыгнутую, сярэдняга ўзросту постаць, у мужчынскім кажушку і ботах, з прыплюшчанымі вачыма, што надае яе твару заўсёдную задуменнасьць. На першы погляд маўклівая, яна на ўсіх вучастках пасьпявае арганізаваць, наладзіць і сплянаваць даручаную ёй работу, бо ў яе цяпер багата жыццёвай практыкі і вопыту.

Апошнія тры гады былі напоўнены густой гераічнай працай. Нездарма яна за гэты час прэміявалася 6 раз. Нават прышоўшы дахаты, яна не пакідае жыць фабрыкай. Будзе падрабязна расказваць, дзяліцца з дачкой радасьцю працы. Пра фабрыку расказвае, як пра звычайную рэч, голас яе танклявы, ціхі, аднатонны, але ў ім гучыць бязьмежнасьць цёплага замілаваньня і пашаны да сваёй работы. Самая прыемная грамадзкая нагрузка—сацбытавы сэктар, і яна ня можа ўстрымацца, каб не расказаць пра яе, расказаць, як з дэлегатамі свайго цэху сочаць за гігіенай, правяраюць работу дзіцячых ясьляй, як даглядаюцца і кормяцца дзеці. Калі хто на фабрыцы захварэе, яна пасьля працы выпісвае на дом доктара, а пасьля яго агляду заходзіць да хворага на дом, даведацца пра яго здароўе. Бывае прыдзе, а хворая бялізну мые, або да суседзяй пойдзе пагуляць.

— У такіх мы адбіраем бюлетэні—кажа Барзенкава,—а грошы на іх са страхкасы забіраем на патрэбы сацсэктару. Такім чынам у нас ужо склаўся страхавы фонд. За сабраныя грошы аднаго рабочага паслалі на рамонт здароўя—на курорт. Гэта значыць, аднаго сухотнага вернем зноў да работы—і, гаворачы, радуецца, быццам на курорт паслалі яе самую.

Прыгадваецца ёй вечар перад 15 гадавінай Кастрычніка. Беларускі тэатр бітком набіт рабочымі іхняй фабрыкі. Гаворыць старшыня гарпрафсавету перад паўтаратысячным калектывам.

— З посьпехам заканчваючы першую пяцігодку, сёньня мы лепшым змагаром-ударнікам надаем годнасьць герояў сацыялістычнай працы першай пяцігодкі. Звычайнае слова герой, але ў ім жыве вялікі зьмест штодзеннай жывой гераічнай працы.

Нараджаецца новы рабочы дзень, які прынясе людзям за іх працу новую радасьць перамогі. І Барзенкава ідзе на працу, ідзе насустрач сонцу.

(*Канец*).

Віцебск. Акулярная фабрыка.

Лісты работніц і калгасьніц

У папках рэзалюцыі, у сталоўках—бруд

Па Крычаўскаму раёну абвешчан месячнік санітарыі. На шырокім міжсаюзным сходзе рабочых і служачых і на канфэрэнцыі асьветнікаў былі прыняты прыгожыя рэзалюцыі аб тым, каб у часе гэтага месячніка дабіцца канкрэтнага паляпшэньня санітарнага становішча сталовак, жылых памяшканьняў, установ і прадпрыемстваў, а таксама вуліц. Але гэтыя рэзалюцыі засталіся ляжаць у папках прафсаюзных кіраўнікоў, а бруд, як і раней, пануе ня толькі ў вёсцы, але і ў горадзе.

У сталоўцы № 1 прадукты валяюцца на бруднай падлозе, тут-жа чысьцяць бульбу, разьліваюць ваду. Бакі, у якіх вараць страву, брудныя. Па дварэ нельга прайсьці з-за бруду і памыі. Ня лепшае становішча і ў іншых сталоўках.

Галя.

Змагаемся за чыстату і здароўе

На Магілеўскім чыгуначным вузьле разгарнулася работа па санітарным абслугоўваньні пасажыраў і рабочых чыгуначнікаў. Створана вузлавое санітарнае бюро з 5 асоб, у якім актыўна працуюць 4 работніцы.

Бюро арганізавала на вузьле 19 санітарных брыгад, 9 санітарных пастоў і 14 сан'ячэек, а таксама сан'ячэйкі ў суседніх саўгасе і калгасе.

Санітарныя брыгады абсьледавалі санітарнае становішча сталовак, кватэр рабочых і служачых, а таксама вытворчасьць, інтэрнаты і вакзал. Санітарныя пасты ва ўсіх пералічаных пунктах працуюць без перапынку. Члены санітарных брыгад правялі прышчэпку воспы 1.046 пасажырам.

Арганізавалі гурток першай дапамогі, які нармальна працуе. Дзякуючы гэтай рабоце, на ўсім вузьле ліквідаваны эпідэмічныя захворваньні. Палепшылася санітарнае становішча вакзалаў, інтэрнатаў, сталовак і кватэр рабочых.

Заклікаем усіх работніц і калгасьніц разгарнуць у сябе на вытворчасьці ў калгасах барацьбу за ажыцьцяўленьне санітарнага мінімуму, за здаровую працу, за здаровае жыльлё.

Чл. санітарн. бюро Канчыелава.

Харчаваньне ў ясьлях дрэннае

У камуне „Бальшавік", Менскага раёну, арганізаваны ясьлі на 25 дзяцей. Пакоі чыстыя, бялізна на дзецях і пасьцельная бялізна мяняецца часта. З дзецьмі вядзецца рэгулярная выхаваўчая работа. Маткі задаволены доглядам, які атрымліваюць іх дзеці ў ясьлях, але кормяць дзяцей дрэнна. Савет камуны зусім не клапоціцца аб тым, каб як-небудзь палепшыць харчаваньне ў ясьлях.

Лашкевіч Роза.

Рацыяналізатарская старонка

За актыўны ўдзел у рацыяналізацыі і вынаходзтве

Найбольш разьвіць у прамысловасьці і калгасах прадукцыйнасьць працы, дабіцца бальшавіцкіх колькасных і якасных паказальнікаў, павысіць ураджайнасьць калгасных палёў, зрабіць калгасьнікаў заможнымі, падняць калгасную гаспадарку на ступень ўзорнай сацыялістычнай гаспадаркі—гэта значыць рацыянальна арганізаваць працу рабочага на вытворчасьці, калгасьніка ў калгасе, рацыянальна мэханізаваць вытворчасьць і сельскую гаспадарку на падставе сацыялістычнай тэхнікі, паставіць на вышэйшую ступень улік.

Адным з асноўных сродкаў для вырашэньня гэтай галоўнай задачы 2-ой пяцігодкі зьяўляецца **масавае вынаходзтва і сацыялістычная рацыяналізацыя.**

У першую пяцігодку **вынаходзтва і рацыяналізацыя, галоўным чынам, у прамысловасьці і транспарце далі нашай краіне каля двух мільёнаў** рублёў эканоміі, скарацілі ўвоз машын і абсталяваньня з-за мяжы, узьнялі вытворчасьць на вышэйшую ступень. Калгасныя масы да гэтага часу слаба ўцягнуты ў гэту калектыўную творчую работу. Творчая энэргія калгасных мас прабіваецца на паверхню жыцьця пакуль што ў выглядзе адзіночак-вынаходцаў **Бурака Казлоўскага** і іншых. Асабліва мала ўдзельнічаюць у справе вынаходзтва і рацыяналізацыі жанчыны-работніцы і калгасьніцы.

Справа заключаецца ня ў тым, каб уся маса работніц і калгасьніц імкнулася адразу вынаходзіць машыны. Важна, каб кожны рабочы, кожны калгасьнік, работніца, калгасьніца, на сваім рабочым месцы выяўляў-бы недахоп ў рабоце, ускрываў-бы ўсё, што шкодзіць вытворчасьці, уносіў-бы свае прапановы для іх зьнішчэньня, не саромячыся ўносіць самыя дробныя прапановы, бо яны ўвогуле прынясуць нам шмат эканоміі.

Партыя і ўрад надаюць вялізарнае значэньне масаваму вынаходзтву і сацыялістычнай рацыяналізацыі. Рэдакцыя часопісі „Работніца і Калгасьніца Беларусі" з гэтага нумару пачынае рэгулярна выпускаць старонку па вынаходзтве і рацыяналізацыі, у якой будуць адлюстроўвацца творчыя дасягненьні працоўных, асабліва жанчын, будуць зьмяшчацца карэспандэнцыі па вынаходзтве і рацыяналізацыі, будзе арганізаван абмен вопытам і г. д.

Рэдакцыя разам з Цэнтральным домам тэхнікі (Менск, Камсамольская, 25) арганізавала бясплатную кансультацыю для жанчын-вынаходніц і рацыяналізатараў. У гэту кансультацыю можна зварачвацца як пісьмова, так і вусна. Адказы на ўсе пытаньці даюць спэцыялісты-інжынэры, тэхнікі. Прыём у нячотныя дні, ад 10 да 12 гадзін дня і ад 7 да 9 гадзін вечара.

Пісьмовыя запытаньні трэба накіроўваць па адрасе: Менск, Камсамольская, 25, Цэнтральны дом тэхнікі, у юрыдычна-прававую кансультацыю, або рэдакцыя часопісі „Работніца і Калгасьніца Беларусі", Менск, Савецкая, 63.

Работніцы і калгасьніцы, за вамі слова і справа ў галіне вынаходзтва і рацыяналізацыі. Уносьце вашы прапановы, уключайцеся ў рады перадавых ударнікаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Чырвоны абоз з сенам у гонар вынаходзтва

Калі брыгада з Цэнтральнага дому тэхнікі і рэдакцыі часопісі „Работніца і Калгасьніца Беларусі" да агульнага сходу пачала гутарыць аб вынаходзтве Бурака з асобнымі членамі праўленьня калгасу, нават сам старшыня калгасу Ляшкоў казаў: „Няўжо Бурак, такі спакойны, ціхі, нясьмелы чалавек, ды да таго малапісьменны можа займацца вынаходзтвам?"

Хутка сабраліся ўсе калгасьнікі на сход, прышлі нават і старыя, была чутна ціхая гаворка: „Няўжо мог такія „цуды" стварыць Рыгорка наш?".

Інжынэр Літвяноўскі пачаў растлумачваць праект вынаходзтва бульбакапалкі. У залі панавала цішыня. З вялікай зацікаўленасьцю слухалі калгасьнікі тлумачэньне.

Пасьля пасыпаліся пытаньні, асабліва з боку жанчын: „Ці будзе сартаваць камбайн бульбу. Колькі гэктараў за дзень выкапае. А што будуць рабіць жанчыны, калі на сацыялістычных палёх зьявіцца такая вялікая машына?"

Яшчэ не закончыліся пытаньні, як зразу Даша Багданчык—зьвенавод другой брыгады абвясьціла сваё зьвяно ў гонар вынаходзтва ўдарным па правядзеньні другой праполкі і за 8 дзён зжаць жыта бяз страт і першы абмалот здаць дзяржаве.

Багданчык выклікала на сацспаборніцтва другое зьвяно другой брыгады. Выклік прынят.

Член праўленьня калгасу Камоцкі Янка—зьвенавод першай брыгады абвясьціў сябе ўдарнікам і абавязаўся кожны дзень больш нормы выконваць па сенажаці, а таксама ў часе жніва працаваць на жняярцы ад цямна да цямна без прагулаў.

Манцэвіч Марыля таксама абвясьціла сябе ўдарніцай і з вялікім энтузіязмам заявіла: „Калі Рыгор вынаходца, дык я буду ўдарніцай, заўсёды нормы буду перавыконваць добраякасна".

Калгас „Чырвоны араты" арганізаваў 19-га ліпеня чырвоны абоз з сенам.

Былі на сходзе і спробы кулацкіх агентаў сарваць сход і апарочыць вынаходцу. Ляшкова—жонка жывёлавода—крычала на сходзе: „Бурак не вынаходца, яму знаёмы тэхнік даў праект". Ляшкова атрымала рашучы адпор ад усёй калгаснай масы.

Таварышы калгасьніцы, па прыкладзе Бурака прымусьце свой розум, сваю кемлівасьць і вопыт служыць справе паляпшэньня сваёй калгаснай гаспадаркі, прымайце актыўны ўдзел у рацыяналізатарстве і ў вынаходзтве на карысьць сацыялістычнай справы.

Магілеўская.

Смалявіцкі раён.

Калгасьнік Бурак — вынаходца бульбакамбайну

У калгасе „Чырвоны араты", Смалявіцкага раёну, стары калгасьнік Рыгор Бурак на працягу трох год займаецца вынаходчай работай.

У цэнтральны дом тэхнікі ён зьвярнуўся з апошнім сваім вынаходзтвам „бульбакамбайнам". Дом тэхнікі разам з рэдакцыяй часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" накіраваў у калгас „Чырвоны араты" брыгаду спэцыялістаў для аказаньня тэхнічнай дапамогі па ўсіх вынаходзтвах Рыгора Бурака і наогул аказаньня калгасу тэхнічнай і агра-тэхнічнай дапамогі па падрыхтоўцы да ўборачнай. Сярод вынаходзтваў Рыгора Бурака: 1) палепшаная руская печ, у якой аўтар скарыстаў адыходзячыя гарачыя газы для абагрэву памяшканьня праз нескладаную канальную сыстэму. Такую печ Бурак зрабіў у сваёй хаце. Печ дае вялікую эканомію ў паліве. 2) Мадэль штучнай рукі для калек. Зараз Бурак працуе над тым, як скарыстаць сілу ветру і ў сельскай гаспадарцы.

Дом тэхнікі прыняў шэфства над вынаходцам. Брыгада абмеркавала пытаньне аб работах Бурака на агульным сходзе калгасу.

Сход пастанавіў Рыгора Бурака прэміяваць, арганізаваць ячэйку вынаходцаў і рацыяналізатараў. Гэта ячэйка зьяўляецца пакуль што першай ячэйкай сярод калгасаў БССР.

Вынайдзены калгасьнікам Бураком бульбакамбайн мае вялікія перавагі перад транспартнымі бульба-ўборачнымі машынамі, а іменна, у Бурака ёсьць мэханічнае сартаваньне замест ручнога, а галоўнае—у Бурака зусім новы прынцып работы конвэера—толькі аднэй веткай. Праект Бурака быў абмяркован на пасяджэньні навукова тэхнічнага экспэртнага савету Дому Тэхнікі з удзелам прадстаўнікоў Наркамзему БССР, зьлёту вынаходцаў і 6 экспэртаў спэцыялістаў.

Інжынэр А. Літвіноўскі.

Парады агранома

Захаваем ураджай ад шкоднікаў

Сваячасовая і належная падрыхтоўка сьвірнаў да новага ўраджаю адыгрывае вялікае значэньне для аховы ў далейшым насеньня ад сьвірнавых шкоднікаў. Кожны год ад іх на мільёны рублёў гіне рознага насеньня.

У нас у большасьці калгасаў і саўгасаў няма яшчэ спэцыяльна пабудаваных збожжахавальнікаў і захоўваць збожжа ў большасьці прыходзіцца ў непрыстасаваных да гэтага памяшканьнях, дзе шкоднікі маюць усе ўмовы для сваіго разьвіцьця.

У сучасны момант, калі збожжахавальнікі яшчэ пустуюць, кожны калгас і саўгас павінны прыняць усе захады, каб іх падрыхтаваць належным чынам для прыёмкі новага ўраджаю.

Раней, чым гаварыць аб мэтадах барацьбы, трэба ведаць жыцьцё галоўных шкоднікаў сьвірнаў. Больш за ўсё ў нас пашыран сьвірнавы даўганосік, гарохавая зярноўка і мучны клешч.

Сьвірнавы даўганосік зьяўляецца вельмі пашыраным шкоднікам па БССР. Па сваёй шкоднасьці ён займае першае месца сярод сьвірнавых шкоднікаў. Сам даўганосік мае выгляд жучка, цёмна-цэмантавага колеру. Галава яго выцягнута ў доўгі хабаток. Размнажаецца ён яйкамі. Саміца даўганосіка кладзе яйкі па адным на кожнае зерне. Усяго саміца адкладвае каля 150 яек. Праз два тыдні з яйка выходзяць чарвячкі, якія жывяцца насеньнем. Потым чарвячок ператвараецца ў лялечку, з якое выходзіць даўганосік.

Гарохавая зярноўка наносіць страту насеньню бабовых расьлін, у большасьці гароху. Яна пападае ў сьвіран у тым выпадку, калі насеньне пашкоджана ёю яшчэ ў полі. Гарохавая зярноўка—гэта жук, які мае невялікі разьмер чорнага колеру. Вясной саміца жука кладзе на стручкох гароху яйкі да 18—25 шт., з якіх выходзяць чарвячкі. Яны ўядаюцца ў нутро зярнят, дзе і жывуць, а потым пры ўборцы ўраджаю пападаюць у сьвіран.

Мучны клешч наносіць страту муцэ. Разьмер яго вельмі невялікі, яго цяжка заўважыць простым вокам, бо ён бясколерны. Ад прысутнасьці кляшчоў у муцэ яна набывае вельмі дрэнны пах і ў большасьці траціць сваю вартасьць.

Меры барацьбы.

Трэба адзначыць, што лепшымі ўмовамі для разьвіцьця сьвірнавых шкоднікаў зьяўляецца душнае паветра, вільгаць, адсутнасьць сьвятла, брудное становішча сьвірнаў. Таму ў сучасны момант кожны калгас і саўгас павінны добра прасушваць памяшканьні, выграбці ўсё сьмецьце са сьвірнаў. Калі склад будзе праветран і ачышчан ад сьмецьця, трэба зрабіць вільготную або газавую дэзынфэкцыю. Вільготную дэзынфэкцыю трэба праводзіць шляхам апырскваньня або абмазкі сьцен газавапнавай мешанінай з каустычнай содай. Апырскваньне газавапнавай мешанінай лепш рабіць апырсквальнікам з наканечнікам „Сэнэка". Апырскваньне трэба пачынаць з верхняй часткі памяшканьня. Чалавек, які робіць апырскваньне газавапнавай мешанінай, павінен быць апранут ў брэзэнтавы плашч і гумовыя рукавіцы і з акулярамі на вачох, бо ў выпадках пападаньня мешаніны на цела, яна можа выклікаць апалы.

Газавы мэтад заключаецца ў тым, што барацьба з сьвірнавымі шкоднікамі вядзецца шляхам ўжываньня хлёрапікрыну, серкавага і серкавугляроду. Пры апырскваньні каустычнай содай на 12 літраў вады трэба браць 400 грам соды. Раствор гэты ўжываецца супроць мучных кляшчоў.

Газавае акурваньне можна рабіць толькі там, дзе памяшканьне надта шчыльнае і не прапускае пароў вышэй зазначаных матэрый.

Маркавец.

Гігіена жыльля

Дыханьне і паветра. Жыльлё служыць нам для таго, каб абараніць наша цела ад непагоды і ад холаду. *Гігіена патрабуе, перш за ўсё, каб паветра ў кватэры было чыстае і сьвежае, каб кватэра была сухой і цёплай, каб у ёй была патрэбная колькасьць сьвятла і каб яе ўтрымлівалі ў чыстаце.*

Каб зразумець *гігіену паветра ці гігіену дыханьня*, мы павінны адказаць на два пытаньні:

1) Навошта нам патрэбна паветра або дыханьне?

2) Якое паветра лічыцца чыстым?

Вядома, што чалавек можа пражыць без яды 4 тыдні, без вады—2 тыдні, але без паветра—усяго адну або некалькі мінут. Паветрам мы дыхаем. Дыханьне складаецца з двух момантаў: з удыханьня і выдыханьня. Пры ўдыханьні наўкольнае паветра ўводзіцца праз рот і нос у гартань, адтуль праз трахэю (дыхальную трубку) у лёгкія. Пры выдыханьні паветра выходзіць з лёгкіх назад тымі самымі шляхамі.

Склад паветра. Але склад наўкольнага паветра, якое мы удыхаем, значна адрозьніваецца ад складу дыхальнага паветра. Паветра наогул зьяўляецца мешанінай з розных газаў. У 100 частках *ўдыханага паветра* ёсьць 21 частка кісларoду, 0,63 вуглякіслаты і 78,97 частак іншых газаў (азот і інш.), а ў 100 частках *выдыханага паветра*—16 частак кісларoду, 4 часткі вуглякіслаты і 80 частак іншых газаў.

Кісларод—гэта галоўнейшы газ, які мае вялікае значэньне ня толькі для нашага здароўя, але і для нашага жыцьця. У тым паветры, дзе няма або вельмі мала кісларoду, гіне кожная жывая істота. Пры ўдыханьні кісларод наўкольнага паветра трапляе ў нашы лёгкія і адтуль разносіцца па крыві да ўсіх тканак і клетак нашага цела. У тканках ад згараньня кісларoду ўтвараецца іншы газ—*вуглякіслата*, які шкодны для нашага арганізму. Гэты газ выносіцца крывёю назад у лёгкія, а адтуль мы выдыхаем яго. Такім чынам у нашых лёгкіх у часе дыханьня адбываецца *абмен газаў*.

Цяпер зразумела, чаму такая розьніца паміж колькасьцю кісларoду і вуглякіслаты ва ўдыханым і выдыханым паветры.

Вось і адказ на першае пытаньне, чаму і навошта нам патрэбна дыханьне для працэсаў згараньня матэрый, якія неабходны для нашага жыцьця.

Зразумела, што і на другое пытаньне мы цяпер можам даць адказ: чыстае, здаровае паветра—гэта тое, якое мае ў сабе выстарчальную колькасьць кісларoду.

Але не ва ўсіх мясцох паветра мае ў сабе аднолькавую колькасьць кісларoду. Больш за ўсё кісларoду там, дзе ёсьць расьліннасьць, г. зн. у лясох, у садох, на палёх і г. д., бо расьліны ўдзень выдзяляюць шмат кісларoду. Вось чаму людзі, якія жывуць у гарадох, дзе ўлетку паветра бывае цяжкае, душнае, імкнуцца ў часе сьпёкі падыхаць сьвежым паветрам у якім-небудзь садзе.

Шмат кісларoду ёсьць і ў морскім паветры ад выпарваньня морскай вады. Таму на морскім беразе паветра бывае чыстае і сьвежае.

Вядома таксама, што пасьля навальніцы лягчэй дыхаць, бо тады выдзяляецца ў атмасфэры шмат кісларoду.

Шкоднае паветра. *Вуглякіслата*—гэта шкодны газ—утвараецца ў паветры ад дыханьня чалавека і жывёлы, ад гарэньня дроў, нафтавых лямп і сьвечак, ад гніцьця харчовых і іншых прадуктаў і г. д. Вось чаму цяжкае паветра бывае ў тых хатах, дзе рэдка адчыняюцца вокны або форткі, яшчэ больш вуглякіслаты бывае ў памяшканьнях, дзе зьбіраецца шмат людзей (на фабрыках, у тэатрах, школах, клюбах, кіно і г. д.), а таксама на броварах і дражджавых заводах, у капальнях.

У паветры ёсьць яшчэ ў малой колькасьці *вадзяная пара*. Калі яе ў паветры мала, гэта значыць, калі *паветра надта сухое*, як гэта бывае ў качагарках, на жалезаплавільных заводах і т. п., то ў работнікаў у гэтых памяшканьнях можа разьвіцца катар дыхальных шляхоў. Але яшчэ больш шкодна ўплывае на здароуе *залішняя вільготнасьць паветра*. Усім вядома, што густыя туманы шкодны для здароўя, што ў вільготным памяшканьні людзі часта хварэюць на катар дыхальных шляхоў, раматус, малакроўе. Дзеці, якія жывуць у вільготных кватэрах і сутарэньнях, маюць бледы колер твару і часта хварэюць на залатуху. У вільгаці таксама множацца розныя віды мікробаў і таму там часьцей бываюць заразьлівыя хваробы.

Апрача газаў і вадзяной пары ў паветры знаходзіцца яшчэ *пыл*, які складаецца з вельмі дробных часьцінак пяску, сажы, вугалю, валасоў чалавека і жывёлы і г. д. Гэты паветраны пыл мы бачым на вуліцах, калі ён уздымаецца ад ветру. Мы яго таксама бачым у памяшканьнях на мэблі, на падлозе, на вокнах, калі іх доўга не выціраюць. Ёсьць яшчэ дробны пыл, які можна ўгледзець толькі ў сонечны дзень, калі сонечныя прамені праходзяць праз вакно. У пыле знаходзяцца мікробы, якія простым вокам убачыць нельга.

Усякі пыл шкодны для здароўя, бо ён раздражьняе дыхальныя шляхі. Але значны і нават небясьпечны ўплыў на здароуе мае пыл з атрутных часьцінак—сьвінцовы (у друкарнях), вапнавы і тытунёвы пыл. Гэты пыл можа атруціць увесь арганізм. Надзвычай шкодны пыл, які ёсьць у паветры на шчаціных, шчотачных, тэкстыльных фабрыках, у млынох, пільнях і г. д. Ад гэтага пылу ў дарэвалюцыйны час хварэла на лёгачныя хваробы шмат рабочых, але ў сучасны момант, дзякуючы розным мерапрыемствам з боку органаў аховы працы, як тэхніка бясьпечнасьці, вэнтыляцыя і іншыя мерапрыемствы, захворваньні ад пылу амаль зьніклі.

Апрача пылу ў паветры ёсьць яшчэ вельмі *шкодныя газы і пары*, якія ўтвараюцца ад гніцьця харчовых прадуктаў і ад выдзяленьняў чалавека і жывёлы. Яны псуюць паветра і распаўсюджваюць смурод у закрытых памяшканьнях.

Вельмі небясьпечнай зьяўляецца прымешка ў паветры памяшканьня газу, які называецца *чадам*.

(*Працяг будзе*).

Выданьне ЦК КП(б)Б Адк. рэдактар Э. ШАПІРА

Друкарня імя Сталіна Заказ № 1740 У ліку 12.000 экз. Менгорліт № 1416

Здана ў набор 23-VII—33 г. Падпісана да друку 31-VII—33 г.

Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.